Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 СНЕЖНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 245 (28103) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У новы год — з «Каралевай»? Лёгка!

СТАР. 4

Чаму цяпер менш добрых фільмаў?

СТАР. 14

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

РАДАСЦЬ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ І МАЛЫХ

Фота БЕЛТА.

У мікрараёне Лябяжы Цэнтральнага раёна Мінска адкрылася новая дзіцячая дашкольная ўстанова. Яна разлічана на 190 месцаў. Цырымонію адкрыцця ясляў-садка № 28 наведалі памочнік Прэзідэнта Беларусі — галоўны інспектар па Мінску Аляксандр Якабсон, першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл Мірончык і іншыя афіцыйныя асобы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:

«Сітуацыя на знешніх рынках яшчэ больш пагаршаецца, тым не менш, рэзістэнцыя беларускай эканомікі ўжо не такая, як была ў снежні мінулага года, калі назіраліся негатыўныя тэндэнцыі на спажывецкім рынку. Знешнія працэсы падобныя, але вы бачыце, што мы спакойна, упэўнена пераадольваем гэтую сітуацыю. Людзі заўважылі, што наша эканамічная, грашова-крэдытная, фінансавая палітыка стала прадказальнай. Мы робім усё магчымае ў нашай сённяшняй сітуацыі, але без гвалту над здаровым эканамічным сэнсам. Гэта значыць, мы робім толькі тое, што лічым магчымым і патрэбным у дадзены канкрэтны момант».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 18.12.2015 г.

Долар ЗША	18338,00	▲
Еўра	19915,00	▼
Рас. руб.	259,92	▲
Укр. грыўня	777,86	▼

ISSN 1990 - 763X

■ Рэсурсы

ЭНЕРГІЯ ВЕТРАНЫХ МЛЫНОЎ

У Навагрудскім раёне будуюць самы магутны ў краіне ветрапарк

З усіх альтэрнатыўных крыніц энергіі гродзенскія спецыялісты вырашылі зрабіць стаўку на сілу ветра. Чатыры гады таму тут паставілі першую энергаўстаноўку, і цяпер, калі яна даказала эфектыўнасць і рэнтабельнасць, пачаўся мантаж яшчэ пяці генератараў. Іх сумарная магутнасць складзе 7,5 мегавата; такім чынам, ветрапарк зможа выпрацоўваць за год 18,45 мільёна кілават-гадзін электраэнергіі.

Вышыня аднаго ветрака — з 30-павярховы дом. Для работы генератара хапае хуткасці ветру 3 метры ў секунду. Праект паблізу вёскі Грабнікі рэалізуе РУП «Гроднаэнерга». Ужо ў наступным годзе на гэтай пляцоўцы з'явіцца самы магутны ў краіне ветрапарк. Шэсць масіўных установак будуць выпрацоўваць пятую частку электраэнергіі, якую спажывае Навагрудскі раён. Аб'ект коштам Br348,1 млрд рэалізуецца па інвестыцыйнай праграме «Белэнерга», у тым ліку $ 11,8 млн складзе звязаны крэдыт на абсталяванне Дзяржаўнага банка развіцця Кітая. Генеральным падрадчыкам будаўніцтва з'яўляецца ААТ «Белэлектрамантажналадка». Максімальны аб'ём работ па мантажы плануюць выканаць да 25 снежня, а ўвесці аб'ект у эксплуатацыю збіраюцца ў маі 2016 года.

У Беларусі доля аднаўляльных крыніц пакуль невысокая — каля 1%. Цяпер у краіне працуе 50 ветракоў. Самы буйны праект — ветрастанцыя ў Магілёўскай вобласці: 8 установак магутнасцю па 1 мВт. Пад Навагрудкам усталююць яшчэ больш магутныя генератары, каб выкарыстоўваць усе магчымасці пляцоўкі. Тэрмін акупнасці такога праекта меншы за 10 гадоў. Да таго ж дзяржаўныя прэферэнцыі — вызваленне ад выплаты ўвазных пошлін і павышаны на траціну кошт пры закупцы электраэнергіі — робяць вецер вельмі прыбытковым. І яшчэ на куплі прыроднага газу за год работы ветраўстаноўкі ў Навагрудскім раёне ўдасца сэканоміць каля тысячы кубаметраў, ці больш за 4 мільярды рублёў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ЧЛЕНЫ ЎРАДА НАЗНАЧАНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 снежня падпісаў указ № 500 аб назначэнні членаў урада, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У адпаведнасці з пунктам 7 артыкула 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь назначаны:

МАЦЮШЭЎСКІ Васіль Станіслававіч — першым намеснікам прэм'ер-міністра,

КАЛІНІН Анатоль Мікалаевіч — намеснікам прэм'ер-міністра,

КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — намеснікам прэм'ер-міністра,

РУСЫ Міхаіл Іванавіч — намеснікам прэм'ер-міністра,

СЯМАШКА Уладзімір Ільіч — намеснікам прэм'ер-міністра,

ЧОРНЫ Анатоль Барысавіч — міністрам архітэктуры і будаўніцтва,

ШУНЕВІЧ Ігар Анатольевіч — міністрам унутраных спраў,

ЦЕРАХАЎ Аляксандр Аляксандравіч — міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі,

ЖАРКО Васіль Іванавіч — міністрам аховы здароўя,

МАКЕЙ Уладзімір Уладзіміравіч — міністрам замежных спраў,

АНАНІЧ Лілія Станіслававаўна — міністрам інфармацыі,

СВЯТЛОЎ Барыс Уладзіміравіч — міністрам культуры,

АМЕЛЬЯНОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч — міністрам лясной гаспадаркі,

РАЎКОЎ Андрэй Аляксеевіч — міністрам абароны,

ЖУРАЎКОЎ Міхаіл Анатольевіч — міністрам адукацыі,

НАЛІВАЙКА Сяргей Эдуардавіч — міністрам па падатках і зборах,

ВАШЧАНКА Уладзімір Аляксандравіч — міністрам па надзвычайных сітуацыях,

КАЎХУТА Андрэй Марленавіч — міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя,

ВОЎК Віталь Міхайлавіч — міністрам прамысловасці,

ПАПКОЎ Сяргей Пятровіч — міністрам сувязі і інфарматызацыі,

ЗАЯЦ Леанід Канстанцінавіч — міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання,

ШАМКО Аляксандр Ігаравіч — міністрам спорту і турызму,

КАЛТОВІЧ Уладзімір Васільевіч — міністрам гандлю,

СІВАК Анатоль Аляксандравіч — міністрам транспарту і камунікацый,

ШЧОТКІНА Мар'яна Акіндзінаўна — міністрам працы і сацыяльнай абароны,

АМАРЫН Уладзімір Віктаравіч — міністрам фінансаў,

ЗІНОЎСКІ Уладзімір Іванавіч — міністрам эканомікі,

ПАТУПЧЫК Уладзімір Мікалаевіч — міністрам энергетыкі,

СЛІЖЭЎСКІ Алег Леанідавіч — міністрам юстыцыі,

ВАКУЛЬЧЫК Валерый Паўлавіч — старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі,

ГУРУЛЁЎ Сяргей Пятровіч — старшынёй Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта,

ГАЕЎ Андрэй Анатольевіч — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці,

ШУМІЛІН Аляксандр Генадзьевіч — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях,

НАЗАРАНКА Віктар Уладзіміравіч — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі,

МАЛЬЦАЎ Леанід Сямёнавіч — старшынёй Дзяржаўнага пагранічнага камітэта,

СЯНЬКО Юрый Аляксеевіч — старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта,

СОКАЛ Ігар Сяргеевіч — кіраўніком Апарату Савета Міністраў.

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Вырашаць свае набалелыя пытанні жыхары краіны могуць кожную суботу з 9.00 да 12.00 падчас прамых тэлефонных ліній. Спецыялісты адзначаюць, што такая практыка працы чыноўнікаў са зваротамі грамадзян носіць прадукцыйны характар, а званкоў і праблем адпаведна становіцца ўсё менш.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 19 студзеня, правядуць:

Брэсцкі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
кіраўнік спраў КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч (80172224444).

АЛІМПІЯДА ЕДЗЕ ДА НАС!

У 2019-м Мінск прыме Еўрапейскі юнацкі алімпійскі фестываль

Удзельнікамі 15-х па ліку Гульняў стануць больш за 4 тысячы спартсменаў з 50 краін Еўропы, якія аспрэчаць медалі ў 10 відах спорту. У тым ліку ў гульнявых дысцыплінах — гандболе, баскетболе і валейболе.

Учора пад старшынствам **віцэ-прэм'ера Наталлі КАЧАНАВАЙ,** якая з'яўляецца старшынёй аргкамітэта па правядзенні гэтага маштабнага мерапрыемства, абмяркоўваўся ход падрыхтоўкі да яго ў спартыўным, бытавым, культурным, адукацыйным і іншым аспектах — з тым, каб удзельнікі і госці пасля аднадушна сказалі: гэты фестываль — найлепшы.

«Спартыўныя мерапрыемствы будуць праводзіцца ў асноўным у Мінску, — сказала Наталля Качанава, — але будуць задзейнічаны і іншыя рэгіёны, таму што прыедуць маладыя хлопцы і дзяўчаты, якім па 14—17 гадоў, і ім, безумоўна, захочацца паглядзець нашу краіну. А нам трэба будзе паказаць усё тое адметнае, што ў нас ёсць. Так што над гэтым трэба будзе грунтоўна папрацаваць».

Як паведаміў «Звяздзе» **Аляксандр ДУБКОЎСКІ, намеснік міністра спорту і турызму**, спаборніцтвы прымуць асноўныя спартыўныя пляцоўкі сталіцы: «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна», футбольны манеж, Палац спорту і іншыя. У мерапрыемствах таксама плануюць задзейнічаць стадыён «Дынама», які цяпер знаходзіцца на рэканструкцыі.

Аляксандр Сяргеевіч адзначыў, што атрымаць права правесці падобныя статусныя старты было складана, але вопыт Беларусі ў арганізацыі буйных спаборніцтваў, наяўнасць сучасных спартыўных пляцовак і поспехі нашых спартсменаў станоўча паўплывалі на рашэнне генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў.

Галоўныя спартыўныя спаборніцтвы юнацтва пройдуць у Мінску з 21 па 27 ліпеня 2019 года.

Якаў ЖУРБІН.

■ Парламенцкі дзённік

БУДЗЕМ У КУРСЕ

ЧАГО ЧАКАЦЬ АД УСТУПЛЕННЯ КАЗАХСТАНА Ў СУСВЕТНУЮ ГАНДЛЁВУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ

З'яўляючыся членам СГА, Казахстан абавязваецца прадастаўляць дзяржавам — удзельніцам ЕАЭС інфармацыю пра тавары, што ўвозяцца на яго тэрыторыю з трэціх краін. Учора на ранішняй сесіі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ратыфікавалі Пратакол аб некаторых пытаннях увозу і звароту тавараў на мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Мытныя стаўкі і тарыфы

— Гэты пратакол падпісаны ў сувязі з тым, што з першага снежня Казахстан уступіў у Сусветную гандлёвую арганізацыю, — патлумачыў журналістам **Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах.** — Натуральна, гэта дае яму права на ўвоз па паніжаных мытных стаўках на сваю тэрыторыю шэрагу тавараў.

Што немалаважна, гэтыя мытныя стаўкі супадаюць з адзінымі мытнымі тарыфамі Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Я гэты дакумент падзяліў бы на дзве часткі, — адзначыў дэпутат. — У першай вызначаны пералік тавараў, якія падпадаюць пад дзеянне пратакола. Там жа выразна прапісана: калі тавар увезены па адзіным мытным тарыфе і яго ўладальнік аплаціў нашу стаўку, то гэты тавар становіцца таварам краіны ЕАЭС. Прапісана таксама, што Казахстан абавязаны прадастаўляць астатнім краінам — удзельніцам саюза інфармацыю пра гэтыя тавары.

Віталь Буcько звярнуў увагу, што ўсе тавары такую працэдуру не пройдуць, таму ёсць яшчэ шэраг абмежавальных мер.

— Напрыклад, белы цукар, увезены на тэрыторыю Казахстана па стаўках, адрозных ад адзінага мытнага тарыфу, не падлягае распаўсюджанню на іншыя краіны ЕАЭС, — прывёў прыклад парламентарый. — Калі прадукцыя, што падлягае ветэрынарнаму кантролю і надзору, увезена па правілах, якія адрозніваюцца ад правіл ЕАЭС, то сама гэтая прадукцыя, а таксама яе вытворныя не падлягаюць увозу на тэрыторыю астатніх краін ЕАЭС.

Абараніць правы пагранічнікаў

Праект закона, які ратыфікуе пагадненне паміж урадам нашай краіны і кабінетам міністраў Украіны аб дзейнасці пагранічных упаўнаважаных, прадставіў **Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта нашай краіны.**

Пагадненне падпісана ў Кіеве 4 мая гэтага года. Яно вызначае парадак стварэння на беларуска-ўкраінскім участку дзяржаўнай мяжы апарату пагранічных упаўнаважаных, а таксама прапісвае функцыі, правы і абавязкі асоб, што ўваходзяць у гэты апарат.

— Асноўнымі функцыямі апарату пагранічных упаўнаважаных з'яўляюцца: забеспячэнне выканання міжнародных дагавораў паміж нашай краінай і Украінай па пагранічных пытаннях, падтрыманне рэжыму мяжы і расследаванне пагранічных інцыдэнтаў, — пералічыў Леанід Мальцаў. — Таксама ў пагадненні вызначаюцца формы і спосабы ўзаемадзеяння апаратаў пагранічных упаўнаважаных нашай краіны і Украіны па пытаннях аховы дзяржаўнай мяжы, функцыянавання пунктаў пропуску.

Адказваючы на пытанне **дэпутата ад Буда-Кашалёўскай выбарчай акругі №38 Пятра ШОСТАКА** пра тое, што на практыцы дасць гэтае пагадненне, Леанід Мальцаў у першую чаргу назваў сацыяльную і прававую абарону нашых пагранічнікаў.

— Пры расследаванні пагранічных інцыдэнтаў, рознага кшталту надзвычайных сітуацый даводзіцца знаходзіцца і на тэрыторыі іншай дзяржавы, — паведаміў старшыня Дзяржпагранкамітэта. — У гэтым выпадку павінна быць забяспечана прававая абарона.

Працоўных мігрантаў становіцца больш

У другім чытанні дэпутаты прынялі праект законаў, які ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі». Дэпутат **Ганна ЛЯВІЦКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах**, прадстаўляючы дакумент, паведаміла, што часцей за ўсё па легальных каналах нашы суайчыннікі выязджаюць працаваць у Расію і Злучаныя Штаты. Што да тых, хто прыязджае працаваць у нашу дзяржаву, то іх колькасць расце.

— Сёння працоўная міграцыя ў нашай краіне змяняецца як у колькасным, так і якасным вымярэнні, — паведаміла Ганна Лявіцкая. — Аналіз структуры імпарту працы ў нас паказвае, што за апошнія гады прыток працоўнай сілы ў Беларусь значна вырас. Да нас прыязджаюць пераважна жыхары блізкага замежжа, у асноўным з краін постсавецкай прасторы.

Калі ў 2012 годзе колькасць працоўных імігрантаў у нас склала 10 тысяч, то за 9 месяцаў гэтага года адпаведная лічба ўжо перавысіла 24 тысячы чалавек. Большасць працоўных мігрантаў — гэта грамадзяне Украіны, якіх у нас 10 тысяч; таксама шмат грамадзян Кітая і Узбекістана.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Кантроль якасці

ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ НЕ ПРАХОДЗІЦЬ

Калегі па Еўразійскім саюзе высока ацэньваюць наш вопыт па барацьбе з кантрафактам

У Беларусі праходзіць III Міжнародны форум «Антыкантрафакт-2015». У Мінску ўдзельнікі ЕАЭС разглядаюць пытанні мытнага, тэхнічнага рэгулявання, гарманізацыі заканадаўства ў сферы незаконнага абароту прамысловай прадукцыі, сумеснай абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці і спажывецкага рынку. Форум упершыню ў гэтым годзе праходзіць не на тэрыторыі Расіі.

З КАГО БРАЦЬ ПРЫКЛАД

Як вядома, дагавор аб ЕАЭС забяспечвае свабоду руху тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы, правядзення скаардынаванай або адзінай палітыкі ў розных галінах эканомікі. Адной з перспектыўных агульных задач ЕАЭС з'яўляецца правядзенне адзінага маніторынгу агульнага рынку, але яно пакуль не адлюстравана ў Дагаворы. З прычыны гэтага павялічваецца рызыка пранікнення на тэрыторыю ЕАЭС кантрафакту — падробленай прадукцыі.

Як лічыць **дэпутат Дзяржаўнай Думы Расіі Таццяна МАСКАЛЬКОВА,** сярод усіх выклікаў сучаснасці карупцыя, кантрафакт, ценявы бізнес наносяць самы вялікі ўдар не толькі эканомікам дзяржаў, але і маральным асновам грамадства.

«Тыя, хто працуе сумленна, нясуць страты і расчароўваюцца, бо дзяржава не абараняе іх і спажыўца. Кантрафакт здольны разбурыць любую галіну эканомікі. У выніку абароту нелегальнай прадукцыі ў харчовай, лёгкай прамысловасці многія дзяржавы нясуць мільярдныя страты, таму што бюджэт не папаўняецца за кошт даходу ад якасных тавараў», — падкрэсліла Таццяна Маскалькова.

У той жа час калегі па ЕАЭС лічаць, што вопыт Беларусі па барацьбе з кантрафактам з'яўляецца адным з найлепшых у Еўразійскім саюзе. Справа не толькі ў заканадаўстве, але і ў дзеяннях улады, праваахоўных сістэм.

«У Беларусі не спускаюць тым, хто можа здзейсніць фальсіфікацыю. Акрамя таго, строгасць і няўхільнасць пакарання робяць сваю справу. Расіі трэба браць прыклад з Беларусі», — падкрэсліла Таццяна Маскалькова.

АДЗІНЫ БРЭНДАВЫ РЭЕСТР?

Член Калегіі (міністр) па эканоміцы і фінансавай палітыцы Еўразійскай эканамічнай камісіі Цімур СУЛЕЙМЕНАЎ лічыць, што арыенцірам для партнёраў па ЕАЭС беларускую сістэму барацьбы з кантрафактам робіць сістэма штрыхкадзіравання, якая функцыянуе ўжо каля 10 гадоў па такіх ключавых пазіцыях, як алкаголь, бытавая тэхніка.

«Найбольш прыдатныя да фальсіфікацыі таварныя групы ў Беларусі знаходзяцца пад кантролем. Ёсць добрая інфармацыйная база і дакладна прапісаны абавязкі дзяржорганаў і бізнесу», — растлумачыў Цімур Сулейменаў.

Дарэчы, з наступнага года на еўразійскім узроўні плануецца выпрабаваць пілотны праект па маркіроўцы RFID-пазнакамі футравых вырабаў. Калегі па ЕАЭС запазычылі вопыт Беларусі і паклалі яго ў аснову еўразійскіх дакументаў. Гэты механізм, верагодна, запрацуе ўжо з 1 красавіка 2016 года.

Таксама Цімур Сулейменаў адзначыў, што ў краін — удзельніц ЕАЭС сёння няма прэтэнзій адна да адной, аднак ёсць агульнае жаданне наладзіць механізмы, накіраваныя на абарону аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, якія яшчэ не сталі адзінымі.

«Гэта павінен быць дакумент, дзе будуць зафіксаваны ўсе брэнды. Зараз ёсць нацыянальныя рэестры, якія не забяспечваюць цэласнасць даных. Нядобрасумленны імпарцёр усё яшчэ можа гэтым скарыстацца. Напрыклад, паглядзець на тавары, якія ёсць у расійскім рэестры, але няма ў беларускім, а потым правезці іх праз Беларусь. Адзіны рэестр будзе забяспечваць большую бяспеку для рынку ЕАЭС», — падкрэсліў член Калегіі па эканоміцы і фінансавай палітыцы ЕЭК

СІСТЭМА НАГЛЯДУ ЗА ЎНУТРАНЫМ РЫНКАМ

Старшыня беларускага Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА адзначыў, што ў краіне выбудоўваецца сістэма нагляду за ўнутраным рынкам. Ён лічыць, што калі гаворка заходзіць пра кантрафакт, фальсіфікацыю, то мала якая з краін можа заяўляць аб сваёй паспяховасці. Вырашэнне гэтага пытання ўскладняецца адкрытымі межамі і цеснай звязанасцю рынкаў.

«У нашай краіне рашэннямі Прэзідэнта, урада выбудоўваецца сур'ёзная сістэма нагляду за рынкам. У ёй задзейнічаны адразу некалькі органаў дзяржкіравання — Мінгандлю, Міністэрства аховы здароўя, Дзяржстандарт, Мінсельгасхарч, МНС, МУС. Кожны з іх мае задачу і яе вырашае», — адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Акрамя таго, Віктар Назаранка падкрэсліў, што ў Беларусі асаблівую заклапочанасць усё яшчэ выклікае кантрафактная прадукцыя лёгкай прамысловасці з прычыны таго, што на рынках прысутнічае шмат тавараў невядомага паходжання. Таксама старшыня Дзяржстандарту нагадаў, што з 1 студзеня 2016 года ў Беларусі ўступае ў сілу патрабаванне, згодна з якім прадукцыя лёгкай прамысловасці павінна мець дакументы, што пацвярджаюць яе бяспеку і легальнасць набыцця.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Тэхналогіі

4G запушчана ў Мінску

Першы інфраструктурны аператар beCloud запусціў у эксплуатацыю сетку LTE Advanced (LTE Release 10)

Спачатку мінчане, а пасля жыхары абласных цэнтраў і буйных раённых гарадоў змогуць карыстацца паслугамі 4G — мабільнай сувяззю чацвёртага пакалення, якая прыходзіць на змену 3G.

Праектаванне, будаўніцтва і эксплуатацыю забяспечыў інфраструктурны аператар — СТАА «Беларускія воблачныя тэхналогіі», які працуе пад брэндам beCloud. Выкарыстоўваць гэтыя магчымасці можа любы зацікаўлены аператар. «Мабільныя ТэлеСістэмы» сталі першымі, хто правёў неабходную мадэрнізацыю.

Стварэнне адзінай сеткі сотавай электрасувязі па тэхналогіі LTE рэалізуецца ў адпаведнасці з інвестыцыйным праектам «Стварэнне і эксплуатацыя аб'ектаў інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры з выкарыстаннем найноўшых тэлекамунікацыйных тэхналогій і тэхналогій апрацоўкі даных», а таксама Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2012 года «Аб умовах рэалізацыі інвестыцыйнага праекта ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

Паводле слоў **генеральнага дырэктара beCloud Сяргея ПАБЛАГУЕВА**, асноўнай сёння лічыцца ўдасканаленая тэхналогія LTE Advanced, якая дазваляе перадаваць не толькі даныя, але і голас. На момант пачатку работы сталічнай сеткі LTE пакрыццё забяспечаць 150 базавых станцый. У наступным годзе тэхналогія будзе ўдасканальвацца ў Мінску і прыйдзе ў Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна і Магілёў, а да 2020 года — у райцэнтры з колькасцю насельніцтва не менш за 50 тысяч чалавек.

На пачатку LTE Advanced будзе працаваць у дыяпазоне 1800 МГц, пазней — 2600 МГц.

Генеральным падрадчыкам праекта стала кампанія «Бел Хуавэй Тэхноладжыс», якая забяспечыла пастаўку абсталявання, яго мантаж і пусканаладачныя работы і здала заказчыку гатовыя для эксплуатацыі сістэмы.

«Хуткасці ў сетцы LTE Advanced будуць значна вышэйшымі, чым у сетцы 3G, — адзначае **намеснік гендырэктара па камерцыйных пытаннях beCloud Міхаіл ДУКА**. — Сярэднія хуткасці будуць складаць каля 30 Мбіт/с, але ніякіх абмежаванняў для дасягнення 100-140 Мбіт/с у абанентаў не будзе. Праўда, трэба ўлічваць, што рэальныя паказчыкі хуткасці будуць залежаць ад аддаленасці абанента ад базавай станцыі, якасці карыстальнікаў, якія адначасова знаходзяцца ў зоне дзеяння базавай станцыі і жадаюць атрымаць доступ у інтэрнэт, якасці і класа тэлефона, планшэта і інш».

Сёння ў свеце налічваецца 442 LTE-сеткі, запушчаныя ў камерцыйную эксплуатацыю ў 147 краінах.

Тэрміны LTE і 4G не з'яўляюцца сінонімамі. 4G — чацвёртае пакаленне мабільнай сувязі з высокай хуткасцю перадачы даных і павышанай якасцю галасавой сувязі. LTE — адна з такіх тэхналогій, якая мае на ўвазе толькі перадачу даных. LTE па сваіх тэхнічных характарыстыках не адпавядае патрабаванням 4G. Таму сёння асноўнай лічыцца ўдасканаленая тэхналогія LTE Advanced.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

ЗНОЎ ЦЁПЛЕНЬКАЯ ПАЙШЛА

На выхадныя сіноптыкі абяцаюць дождж і +5–10 градусаў удзень

Гэты снежань больш нагадвае позднюю восень, і ў наступныя 3-5 дзён чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

Атлантычныя цыклоны, якія будуць перамяшчацца па поўначы Еўропы, прынясуць новую порцыю цёплага вільготнага паветра. Таму ў выхадныя чакаецца анамальна цёплае надвор'е, якое больш адпавядае тэмпературнаму рэжыму каст-рычніка.

Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. Удзень у многіх раёнах прагназуюцца невялікія дажджы. Месцамі чакаецца туман, раніцай галалёд, а на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе 1-6 цяпла, а на захадзе да плюс 8 градусаў. Амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў суботу. Уначы па поўдні краіны месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1-7 градусаў, удзень — ад 3 да 10 цяпла. У нядзелю будзе ўжо воблачнае з праясненнямі надвор'е. Уначы на большай частцы тэрыторыі ўдзень пройдуць кароткачасовыя дажджы. Па поўдні ўначы месцамі туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 3-8 цяпла, а ўдзень максімальная тэмпература будзе дасягаць плюс 5-10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, і ў пачатку наступнага тыдня захаваецца цёплае надвор'е. У панядзелак чакаецца воблачнасць з праясненнямі, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 1-6 градусаў, а ўдзень — ад 3 да 9 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Сацыяльная выстава 50+

ШЧАСЛІВЫМ І ЗДАРОВЫМ СТАЦЬ НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

Пачынаючы з учарашняга дня ў Палацы мастацтва, што размешчаны ў самым цэнтры сталіцы, на вул. Казлова, асабліва шматлюдна. З усіх канцоў горада едуць сюды тыя, каму за 50. Бо сацыяльная выстаўка-кірмаш для старэйшага пакалення «50 плюс», якая адкрылася ў Мінску ўжо пяты раз, менавіта для іх. Асноўная задача гэтай выставы — дапамагчы людзям элегантнага ўзросту знайсці новыя магчымасці для стварэння паўнавартаснага, шчаслівага жыцця пры выхадзе на пенсію. А тавары і паслугі, прадстаўленыя тут, дапамогуць ім у гэтым.

Вельмі важнае месца ў жыцці прадстаўнікоў старэйшага пакалення займае ўсё, што звязана са здароўем. Гэтая тэма — цэнтральная і на выставе. Тут любы ахвочы можа хутка і без праблем памераць артэрыяльны ціск і атрымаць кансультацыю ўрача-тэрапеўта і герыятра, зрабіць кардыяграму і тут жа атрымаць яе расшыфроўку, вызначыць сваю вагу і індэкс масы цела і нават даведацца ўзровень цукру ў крыві.

— У вас узровень глюкозы 5,3 — выдатны вынік, — усміхаецца наведвальніцы жанчына ў белым халаце.

— А колькі наогул складае норма? — пытаецца тая.

— У апошні час яе перагледзелі ў бок павышэння. Цяпер нормай лічыцца ўзровень да 6,2.

— О, мне можна ў космас ляцець, — радасна выдыхае «пацыентка».

***

Урач-эндакрынолог Гарадскога эндакрыналагічнага дыспансера Жанна Кірыленка гатова пракансультаваць любога ахвотнага: прапальпаваць шчытападобную залозу, адказаць на ўсе пытанні. У чарзе да яе, якая, зрэшты, хутка рухаецца, стаяць нават з вынікамі ўльтрагукавога даследавання: каб доктар расшыфраваў. «У вас усё ў парадку, ёсць невялікі вузельчык, але гэта не страшна. Працягвайце назірацца і абавязкова піце таблеткі, якія вам прызначыў ваш доктар!» — рэкамендуе Жанна Міхайлаўна пажылой жанчыне.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— За тры гадзіны працы я ўжо паглядзела 152 чалавекі, — кажа эндакрынолаг. — Што самае цікавае — да мяне звярнуліся 147 жанчын і толькі 5 мужчын!

***

Жанчыны і на самой справе складаюць пераважную большасць наведвальнікаў выставы. А якая жанчына не думае пра знешнасць?

— Дзяўчаты, хто апошні ў цырульню? — пытаецца ў чаргі пажылая дама ў какетлівым капялюшыку. Тут, на трэцім паверсе выставы, працуюць чатыры майстры-цырульнікі і адзін майстар па манікюры, якія па сацыяльных расцэнках гатовыя зрабіць прыгожай любую наведвальніцу. ...Вось адна з іх устае з крэсла майстра і ўсміхаецца свайму адбітку ў люстэрку: новая стрыжка да твару!

***

Побач арганізавана зона бытавых паслуг са спецыяльнымі тарыфамі для пенсіянераў. Абсалютна бясплатна можна атрымаць кансультацыі натарыусаў, юрыстаў, псіхолагаў. Спецыялісты кансультуюць і па пытаннях санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення, прапануюць розныя турыстычныя і экскурсійныя праекты. А кожная раніца на выставе на працягу амаль цэлага тыдня будзе пачынацца з 15-хвіліннай гімнастыкі пад кіраўніцтвам вядомых чэмпіёнаў пенсійнага ўзросту.

Свае пазнавальна-забаўляльныя праграмы — выступленні творчых калектываў, сустрэчы з паэтамі і іншыя цікавыя мерапрыемствы — на выстаўцы прадстаўляць усе дзевяць тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва сталіцы. Так што добры настрой напярэдадні Новага года ўсім наведвальнікам забяспечаны!

Уваход на ўсе мерапрыемствы выставы вольны.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■

Извещение о проведении 30 декабря 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»

Предмет торгов №1
Здание административно-хозяйственное (наименование – здание административно-производственного корпуса с инвентарным номером 420/С-1070) общей площадью 1573,3 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей с бойлерной, кузницей, складом с инвентарным номером 420/С-1071) общей площадью 385,8 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей со складом материалов с инвентарным номером 420/С-1072) общей площадью 1017,4 кв. м; здание многофункциональное (наименование – здание гаражей со столярным цехом, лабораторией, складом с инвентарным номером 420/С-1599) общей площадью 1032,6 кв. м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание проходной с инвентарным номером 420/С-1600) общей площадью 126,4 кв. м; здание специализированное коммунального хозяйства (наименование – здание туалета с инвентарным номером 420/С-35883) общей площадью 12,2 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-44516) общей площадью 11936,1 кв. м; кран-балка (инв. № 041229); пресс гидравлический (инв. № 041202); станок вертикально-сверлильный ВСН-12 (инв. № 1031); станок настольный (инв. № 044341); станок токарный 1 м63 (инв. № 041677); два стеллажа изготовленных (инв. №№ 070869 и 070870); станок точильно-шлифовальный (инв. № 0124); автозаправочный блок-пункт АБП 00.00.000ПС (инв. № 020090); зеленые насаждения /ель, каштан, рябина, липа/ (инв. № 90022); комплектная трансформаторная подстанция 2 КТПТАС-В/К400/10/0,4-08У1 (инв. № 040088); станция контейнерная автозаправочная КА 33 (инв. № 020089); две топливораздаточные колонки (инв. №№ 020091 и 020092).
Площадь земельного участка – 1,9533 га, кадастровый номер 441300000009000041
Местонахождение – Гродненская область, Лидский район, г. Лида, ул. Мицкевича, 41 (д. 41; д. 41, корп. 1; д. 41, корп. 2; д. 41, корп. 3; д. 41, корп. 4; д. 41, корп. 5)
Начальная цена – 4 809 722 830 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка – 480 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда
Предмет торгов №2
Здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытовых помещений с котельной с инвентарным номером 420/С-35887) общей площадью 70,6 кв.м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытового корпуса со складскими помещениями с инвентарным номером 420/С-36635) общей площадью 252,4 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 3 с инвентарным номером 420/С-47349) общей площадью 6456,88 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 4 с инвентарным номером 420/С-47350) общей площадью 2781,0 кв. м; агрегат минерального порошка ДС-185 (инв. № 042674); агрегат целлюлозной добавки (инв. № 042690); асфальтобетоносмеситель ДС-158 (инв. № 042652); бункер-накопитель /металлоконструкция/ (инв. № 042695); грохот СМД-107 (инв. № 042372); конвейер ленточный КЛ-РОЛ-5 (инв. № 041663); конвейер ленточный ТК-172 (инв. № 041655); три конвейера ТК-18 (инв. №№ 041532, 041533 и 041534); подогреватель жидкого теплоносителя (инв. № 042658); четыре цистерны 20 м³ (инв. №№ 020100, 020101, 020102 и 020103); комплектная трансформаторная подстанция КТП-250 (инв. № 040086); два резервуара стальных 60 и 50 м³ соответственно (инв. №№ 20097 и 593,3)
Сведения о земельных участках: кадастровый номер 423684000060000002, площадь – 0,5957 га; кадастровый номер 423684000060000003, площадь – 1,3591 га; 423684000060000004, площадь – 1,2704 га
Местонахождение – Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, 12, 14 в районе дер. Обманичи
Начальная цена – 2 672 006 674 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка – 260 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда
Предмет торгов №3
Административно-бытовое здание общей площадью 966,8 кв. м (инвентарный номер 611/С-327), ремонтная мастерская общей площадью 2352,3 кв. м (инвентарный номер 611/С-328), проходная общей площадью 60,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-332), гараж общей площадью 1078,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-333), склад общей площадью 88,4 кв. м (инвентарный номер 611/С-331), канализационная насосная станция общей площадью 13,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-330), станция пожаротушения общей площадью 35,0 кв. м (инвентарный номер 611/С-329), трансформаторная подстанция общей площадью 42,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-334), пожарный резервуар (инвентарный номер 611/С-29951), наружные сети канализации (инвентарный номер 611/С-31344, адрес: г. Березино, пер. Промышленный), наружные водопроводные сети (инвентарный номер 611/С-31345, г. Березино, пер. Промышленный), вагон-дом (инв. № 016), вагон-общежитие (инв. № 0023), линия электропередач (инв. № 515), сеть электроснабжения (инв. № 0516) и 26 единиц оборудования: вулканизатор (инв. № 464), аппарат высокого давления (инв. № 1437), генератор EUROPOWER сварочный (инв. № 15), компрессор С-415М (инв. № 00442), пресс РХ-15 (инв. № 455), сварочный аппарат ТДМ-503 (инв. № 95), станок металлорежущий 2М-112 (инв. № 182), станок настольный сверлильный 2МШ2 (инв. № 00439), станок обдирочно-шлифовальный 2Н-1 (инв. № 196), станок отрезной ножовочный (инв. № 0438), станок радиально сверлильный (инв. № 00440), станок сверлильный (инв. № 177), станок токарно-винторезный, модель 161-БМ (инв. № 47), станок точильно-шлифовальный (инв. № 437), установка насосная высокого давления ЭСКО 15-20 (инв. № 48), электроталь (инв. № 505.1), три отопительных котла «МИР-95» (инв. № 010, инв. № 054, инв. № 062), электрогидравлический калун (инв. № 12), трансформатор ТМ-400/10 (инв. № 100), контейнер для хранения топлива (инв. № 223), подъемник ПТО-42 (инв. № 458), бойлер «Бренеран» (инв. № 56), контейнернозаправочная станция (инв. № 476), трансформатор ЭК-250 (инв. № 106)
Площадь земельного участка – 2,0296 га, кадастровый номер 620450100001000276
Местонахождение – Минская область, Березинский район, г. Березино, пер. Промышленный, д. 6 (д. 6, корп. 1, д. 6, корп. 2, д. 6, корп. 3, д. 6, корп. 4, д. 6, корп. 5, д. 6, корп. 6, д. 6, корп. 7)
Начальная цена – 11 129 553 929 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка – 1 000 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда

Продавец имущества – ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, 8, 220099, г. Минск, телефон (017) 212-50-62.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **30 декабря 2015 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.12.2015 по 28.12.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017) 212-50-62 (ОАО «Автомагистраль»).

■ Будзе свята!

СУСТРАКАЦЬ — ДЫК З «КАРАЛЕВАЙ»!

У КОЛЬКІ АБЫДУЦЦА НАВАГОДНІЯ ЎПРЫГАЖЭННІ ДЛЯ ДОМУ?

Карэспандэнты «Звязды» прабегліся па крамах, каб ацаніць асартымент елак і цацак. Сцвярджаем: стварыць у доме перадсвяточны настрой можна з любым бюджэтам.

Ад настольных да чатырохметровых

Знайсці рукатворнае святочнае дрэва можна без праблем. Напрыклад, у Цэнтральным універсальным магазіне сталіцы (ЦУМе) ужо колькі дзён працуе навагодні кірмаш. Стройныя шэрагі зялёных прыгажунь сустракаюць наведвальнікаў на самым уваходзе. Прыкладна палова елак — айчыннай вытворчасці. Астатнія прыехалі ў Беларусь пераважна з Украіны.

Што датычыцца коштаў, то іх дыяпазон даволі шырокі. Усё залежыць у першую чаргу ад памеру і, зразумела, якасці. У любым выпадку арыентавацца трэба як мінімум на паўмільёна рублёў. Самы танны знойдзены намі варыянт — беларуская елка мадэлі «Клеапатра» вышынёй 120 сантыметраў, яе аддаюць за 387 тысяч рублёў. Астатнія дрэвы, вышэйшыя за метр, каштуюць у сярэднім каля 1 мільёна. Напрыклад, беларуская «Ванда» (150 см) — 904 тысячы. А вось за амаль двухметровыя сімвалы Новага года прыйдзецца заплаціць ужо больш: айчынныя «Каралева» і «Беата» (абедзве — па 180 сантыметраў) каштуюць каля 1,2 мільёна.

Па нашых сціплых падліках, каб больш-менш святочна аздобіць паўтараметровую елку, спатрэбіцца 30 шароў і восем метраў мішуры. У суме — 350 тысяч.

Некаторыя з замежных аналагаў амаль адпавядаюць па цэнах беларускім елкам. Так, 180-сантыметровая «Мішэль» абыдзецца ў тыя ж 1,2 мільёна. Іншыя — даражэй. Вось, напрыклад, безыменная елка вышынёй 180 сантыметраў, падобная да славутага блакітнага віду, пацягне ўжо на 2,8 мільёна. А яшчэ адна мадэль пад назвай «Агнія», якая імітуе знаёмую беларусам натуральную елку (з кароткімі іголкамі і вельмі падобнай да сапраўднай «карой»), абыдзецца яшчэ даражэй — 2,4 мільёна за 150-сантыметровы варыянт і 3,3 мільёна за 210-сантыметровы.

Ёсць у продажы і большыя экземпляры. Напрыклад, беларуская «Віктарыя» (300 см) абыдзецца свайму шчасліваму ўладальніку ў 2,6 мільёна, на 30 сантыметраў ніжэйшая — у 2,2 мільёна. Самы ж дарагі варыянт — яе «цёзка» з Украіны вышынёй у чатыры метры. За такую елку давядзецца аддаць... 8,7 мільёна! Даволі шырокі асартымент і зусім маленькіх, «настольных» елак. У сярэднім яны каштуюць ад 100 да 200 тысяч.

— Попыт ёсць на ўсе прапанаваныя тавары, — расказвае **прадавец-кансультант Таццяна ХВІН.** — Самыя маленькія елкі звычайна набываюць людзі сталага веку — не трэба доўга ўпрыгожваць, лёгка данесці... Той, хто жыве ў кватэры, спыняецца на варыянтах вышынёй да двух метраў. Вышэйшыя бяруць уладальнікі ўласных дамоў. А елкі-гіганты звычайна знаходзяць гаспадароў у выглядзе самых розных прадпрыемстваў і кампаній.

У пошуках натуральнага

З 22 снежня ў сталіцы пачнуць працаваць елачныя базары — без выхадных і абеду, з 10 да 19 гадзін. Ужо вядомы і прыкладныя цэны: за натуральнае дрэва да 1 метра — да 140 тысяч; да 2 метраў — не больш за 180 тысяч; да 3 метраў — максімум 220 тысяч.

Але калі вам карціць парадаваць блізкіх і гасцей пахам хвоі раней, можна адправіцца ў шматлікія гандлёвыя цэнтры, пераважная большасць з якіх ужо распачала рэалізоўваць натуральныя елкі. Галоўнае, каб да 31 снежня не прыйшлося ісці ў краму ці на базар паўторна.

Так, у адной з буйных гандлёвых сетак кошты на жывыя елкі пачынаюцца ад 169 тысяч. За самы вялікі экземпляр давядзецца аддаць 300 тысяч. Якраз на нашых вачах адно дрэва ўпакоўвалі для маладой пары, таму можна канстатаваць, што попыт, хоць і не ажыятажны, ужо ёсць.

Акрамя таго, нагадаем, што пры наяўнасці вольнага часу і вялікага жадання жывую елку можна набыць ужо сёння па цэнах, нават ніжэйшых за «базарныя». Для гэтага трэба звярнуцца ў любы лясгас — на куплі святочнага дрэва «без пасярэднікаў» звычайна можна сэканоміць ад 30 да 50 працэнтаў кошту.

Асноўны вытворца — Кітай

— Чаго ў нас толькі няма! — паказвае асартымент навагодніх цацак **намеснік загадчыка секцыі ГУМа Людміла СЛЕПЧАНКА**. — Кожны дзень са склада тавар выгружаем. Новыя паступленні ў нас два разы на тыдзень.

Цацкі тут — на любы густ. Шышкі, хаткі, чаравікі, снегавікі, мядзведзікі... Праўда, найбольшым попытам карыстаюцца звычайныя шары. Вытворцы прапануюць камплекты ў сінім, чырвоным, залатым і сярэбраным колерах. Набор з шасці сярэдніх шароў (дыяметрам 6 сантыметраў) абыдзецца ў 35-50 тысяч рублёў. Столькі ж цацак, але большага памеру, будуць каштаваць ужо каля 120 тысяч. Калі не ўяўляеце сваю ёлку без традыцыйнай верхавіны ў выглядзе зоркі, рыхтуйце яшчэ 60 тысяч.

Жывую елку можна набыць ужо сёння па цэнах, нават ніжэйшых за «базарныя». Для гэтага трэба звярнуцца ў любы лясгас.

Па нашых сціплых падліках, каб больш-менш святочна аздобіць паўтараметровую елку, спатрэбіцца 30 шароў і восем метраў мішуры. У суме — 350 тысяч. Хочаце «дабавіць агеньчыку»? Прыплюсуйце яшчэ 60-80 тысяч — столькі каштуе лямпавая гірлянда.

— Ёсць добрыя святлодыёдныя, — прапануюць у краме. — Не перагараюць, пакуль ніхто вяртаць не прыносіў. Але яны даражэйшыя: ад 170 тысяч за гірлянду да 1,5 мільёна за сетку на акно.

Эксклюзіў ад рамеснікаў

Акрамя ёлачных цацак, можна знайсці безліч іншых аздабленняў для дома. Напрыклад, калядны вянок на дзверы. У залежнасці ад памеру і колькасці дэталяў ён абыдзецца ў 120-250 тысяч. Прапануюць і папулярныя ў еўрапейскім дэкоры шкарпэткі для падарункаў — да 170 тысяч за штуку. У асартыменце таксама ёсць сіліконавыя налепкі на вокны, вітражы.

Калі хочацца эксклюзіву, зробленага ў краіне, можна звярнуцца да нашых рамеснікаў. Тэкстыльныя цацкі на ёлку, пашытыя з тканіны, прадаюць за восем фігурак (усе розныя: і снегавік, і салдацік, і каробкі з падарункамі) аддасце амаль 90 тысяч рублёў. Дзецям бацькі могуць набыць гіпсавую загатоўку з фарбамі, каб тыя самастойна распісалі будучае ўпрыгажэнне. Падобны камплект (адна цацка і некалькі фарбаў) абыдзецца прыкладна ў 30 тысяч.

Фота Надзеі БУЖАН.

У адной з вітрын заўважаем шкляныя шары з надпісам «Зроблена рукамі». Нарэшце нашы беларускія ёлачныя цацкі! На адны шары нанесены арнамент, іншыя аздабляе выява Чырвонага касцёла і стэлы Перамогі. Адна штука каштуе — ад 60 да 100 тысяч.

— Гэта сапраўды ручная праца, але выпускаюцца яны не ў Беларусі. Украіна пастаўляе па нашым заказе, — тлумачыць Людміла Юр'еўна. — Асноўны вытворца астатніх цацак, вядома, Кітай. З беларускага — толькі мішура, якую прыватнік робіць.

Два метры айчыннай гірлянды прадаюць за 20-30 тысяч, больш пухнаты варыянт — за 50. За пачак «дожджыку» просяць менш за 6 тысяч. Праўда, пакупнікі часцей бяруць яго не для ўпрыгожвання ёлкі, а на касцюмы дзецям для навагодніх ранішнікаў.

Для тых, каму звыклыя шары ўжо надакучылі, ёсць больш цікавыя прапановы. Напрыклад, набор драўляных цацак па 30 тысяч за штуку (цана падобных заводскіх упрыгажэнняў амаль такая ж). Набор керамічных цацак (10 штук) аддадуць за 400 тысяч. Аўтарскія калядныя вянкі звычайна даражэйшыя за тыя, што ў гандлёвых цэнтрах, — па 300 тысяч.

Калядныя вянкі, дарэчы, прапануюць і ў кветкавых крамах. З натуральных матэрыялаў.

— Аснову робім з блакітнай елкі, яна не так асыпаецца, — расказваюць у адным з мінскіх фларыстычных салонаў. — Стандартная аснова, дыяметрам 20 сантыметраў, каштуе 360 тысяч. На дэкор — што прымацаваць да вянка, выбіраеце самі — ідзе ў сярэднім 100 тысяч.

Абяцаюць, што такое ўпрыгажэнне пратрымаецца месяц-паўтара.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ,
lyskavets@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

ДАКАПАЦЦА ДА СУТНАСЦІ

Ці спыніць вандалаў указ аб забароне металашукальнікаў

На гэтым тыдні ў жыцці нашай краіны адбылася адна вельмі важная падзея. Магчыма, яна многімі засталася незаўважанай, бо тыдзень быў насычаны навінамі грамадска-палітычнага характару. Але гэтае невялікае — у тры абзацы — паведамленне, што прамільгнула два дні таму ў інфармацыйных стужках, заслугоўвае ўвагі. Найперш тых, хто рупіцца пра захаванне спадчыны. А яшчэ тых, хто гэтую спадчыну бязбожна нішчыць, імкнучыся набіць уласную кішэню.

Я маю на ўвазе ўказ №485, які днямі падпісаў Прэзідэнт. Накіраваны гэты дакумент, як сказана ў афіцыйным каментарыі да яго, «на ўдасканаленне аховы археалагічных аб'ектаў і артэфактаў». Прадугледжаныя ў ім забароны — канкрэтныя і катэгарычныя, як, напрыклад, «выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў для пошуку археалагічных аб'ектаў і артэфактаў дапускаецца толькі пры правядзенні ва ўстаноўленым парадку археалагічных даследаванняў». Акрамя таго, указ забараняе прадаваць і купляць артэфакты.

Карацей, можна небеспадстаўна меркаваць, што «чорныя капальнікі» ў шоку: на іх вачах дагэтуль прыбытковы і амаль легальны (у нас жа што прамым тэкстам не забаронена, тое дазволена) «бізнес» накрываецца медным тазам. Цяпер не паходзіш беспакарана па лесе з «пікалкай» у руках, ды і знойдзенае так проста па выгаднай цане не збудзеш.

Аб тым, наколькі важная гэта праблема, колькі мы страчваем падчас такіх варварскіх раскопак, гаварылася ўжо не аднойчы. Падчас круглага стала, які «Звязда» праводзіла на пачатку гэтага года, яго ўдзельнікі — парламентарыі, навукоўцы, краязнаўцы, прадстаўнікі праваахоўных органаў — білі трывогу: «чорная археалогія» набыла літаральна прамысловыя маштабы. Па гэтай зямлі з металашукальнікам не бадзяўся толькі лянівы, а ўрон, нанесены дзяржаве, вымяраўся вагой выкапаных артэфактаў. Металічная зброя тысячагадовай даўніны, рыцарскія даспехі па такой «шкале» саступалі звычайнаму лому... Выйсцем з гэтага невясёлага становішча ўдзельнікі дыскусіі называлі менавіта падпісаны кіраўніком дзяржавы ўказ.

Матэрыял, апублікаваны па выніках таго круглага стала, сабраў на сайце «Звязды» рэкордную колькасць каментарыяў. Пісалі і рупліўцы спадчыны, якія цалкам пагаджаліся з героямі публікацыі, і ўладальнікі тых металашукальнікаў, якія ставілі пад сумненне мэтазгоднасць барацьбы з імі, мякка так намякаючы, што як шукалікапалі, так і будуць далей, якія б меры супраць іх ні прымаліся. Бо іх шмат, яны асцярожныя (хоць да названага ўказа дакументальна іх дзейнасць фактычна ніяк не абмяжоўвалася, але ж хадзілі больш хаваючыся, пэўна, сумленне ўсё-такі хоць зрэдку тузала), а яшчэ многія маюць індульгенцыю ў выглядзе пасведчання члена таварыства аховы помнікаў ці суполкі нумізматаў...

Цяпер доўгачаканы дакумент ёсць і трэба абавязкова дзейнічаць, інакш разрабуюць і тое, што ў зямлі яшчэ засталося. Наогул, нядрэнна было б правесці аперацыю рэспубліканскага маштабу кшталту «Арсенала» і ўсе металашукальнікі паканфіскоўваць. Цалкам, мне здаецца, лагічна: калі выкарыстанне забаронена ўсім, акрамя прафесійных археолагаў, дык навошта гэтую прыладу дома трымаць? Яшчэ б не пашкодзіла «праверыць спісы» названых вышэй грамадскіх суполак, асабліва на месцах, каб ведаць дакладна, хто сапраўды хвалюецца за захаванне спадчыны ці калекцыяніруе манеты, а хто капае старажытныя курганы толькі дзеля ўласнай выгады. Карацей, можна прымаць розныя меры, каб гэтую эпідэмію спыніць. Думаю, тут убаку не застанецца і міліцыя, бо хлопцы з металашукальнікамі вельмі часта шукаюць — і знаходзяць! — зброю мінулай вайны, яшчэ абсалютна прыдатную для выкарыстання па прамым назначэнні...

Зрэшты, гэта вырашэнне толькі паловы праблемы. Бо другая яе палова — не ў наяўнасці або адсутнасці ў чалавека металашукальніка, геарадара, іншых сучасных прылад для археалагічнага пірацтва, а ў наяўнасці або адсутнасці разумення, ведання, павагі, сумлення. Я з гэтай праблемай сутыкнулася падчас раскопак на гомельскім Палессі пад Петрыкавам. Мы капалі паселішча Пражскай культуры — V стагоддзе, першыя сляды менавіта славян. Асцярожна здымалі рыдлёўкамі тонкія пласты зямлі, цярпліва пераціралі кожную яе пядзю пальцамі. Каштоўнага ў абывацельскім разуменні нічога не знаходзілі: рэшткі прымітыўнай керамікі (продкі не ведалі тады ганчарнага круга), кавалкі жалезнай руды, некалькі танюткіх бронзавых пярсцёнкаў. Але каштоўным было іншае — мы пакрысе выкопвалі абрысы жытла, якое было тут паўтары тысячы гадоў таму. А па гліняным невялікім кавалачку-венчыку кіраўніца нашай экспедыцыі збіралася аднавіць цэлы гаршчок, па кавалку вугаля з ачага — вызначыць з дакладнасцю да дзесяцігоддзя, калі гэты ачаг палілі апошні раз.

Мясцовыя з цікавасцю за намі назіралі і з недаверам ставіліся да нашых знаходак: маўляў, нешта вы ўтойваеце, не можа тузін маладых людзей калупацца ў зямлі два тыдні дзеля некалькіх чарапкоў. Ступень недаверу мы зразумелі за два дні да ад'езду, калі побач з нашым раскопам убачылі зранку глыбокую яміну: мясцовыя «археолагі» вырашылі пашукаць «скарбы» самі. Мы ў роспачы сталі ля той ямы, глядзелі на змяшаныя з пяском кавалкі керамікі, на непапраўна перамяшаныя слаі зямлі і ледзьве не плакалі. А наша кіраўніца з акадэміі пастаяла крыху, а потым рушыла да мясцовай школы. Праз некалькі гадзін яна ўжо тлумачыла натоўпу малечы і падлеткаў і пра першых славян, і пра кераміку, якую ляпілі без круга, і пра слаі, і пра мацярык. Дзеці, сярод якіх, несумненна, былі і тыя, хто капаў ноччу яму, нішчачы старажытную стаянку, слухалі расповед, бы найцікавейшую казку.

Пасля таго, як расказвала яна праз некалькі гадоў, кожнае лета ад добраахвотнікаў на раскопкі адбою не было. І больш ніхто з месцічаў не шкодзіў, спрабуючы самастойна знайсці «багацце», наадварот, адганялі ад раскопу асабліва цікаўных прыезджых.

«Вось з чаго трэба было пачынаць», — сказала яна мне тады. Што ж, і цяпер цяжка з ёй не пагадзіцца.

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV@R

Міраніка МАРТ:

«У БІЗНЕСЕ ТРЭБА ЎМЕЦЬ ХУТКА БЕГЧЫ...»

18 снежня ў эфіры тэлеканала АНТ фінал рэаліці-шоу «Мой бізнес». На працягу трох месяцаў тэлегледачы маглі назіраць, як удзельнікі праекта прайшлі свой шлях станаўлення ад прэзентацыі ідэі да яе рэалізацыі. Тэлегледачы вызначылі ўладальніка грашовага прыза ў памеры 300 мільёнаў. Сярод найлепшых аказаліся вытворца тэкстылю «Трэнд-бай», стваральнікі «Мульцігрыля», прадпрымальнік з «Экалаўкай» і маладыя праграмісты з дадаткам для смартфонаў «Батл. мн». А напярэдадні запыталіся ў галоўнага рэдактара праекта Міранікі Март пра яе ўражанні ад беларускіх бізнесменаў, працы ў новым фармаце і падводныя камяні на шляху да поспеху.

НАВІЗНА — ЗАЎСЁДЫ ПЕРАВАГА

— Міраніка, сёння фінал праекта «Мой бізнес». Якія вашы ўражанні ад удзельнікаў і каму можа належаць перамога?

— Ведаеце, у нас той выпадак, калі незразумела, хто пераможа, бо кожны прафесіянал у тым, чым займаецца. Нельга ж, напрыклад, параўнаць яблык і банан і вызначыць, ад якой садавіны больш карысці. У нас стартапы прадстаўнікоў з розных сфер. Як параўнаць прадукт IT і зборку мульцігрыляў? Яны проста розныя, як і ўсе ўдзельнікі нашага праекта. Усе фіналісты моцныя гульцы. Мы з імі прайшлі за час існавання праекта вялікі шлях, таму кожны мне ўжо як родны чалавек. Я таксама чакаю фіналу, каб убачыць, каму прысудзяць перамогу нашы тэлегледачы. Магчыма, кожны будзе галасаваць за тое, што яму бліжэйшае.

— Ці на роўных у такім выпадку канкурэнцыя?

— Справа ў тым, што ацэньваецца не сама ідэя, а шлях удзельніка ў праекце. У кожнага ментара перад паўфіналам з'явілася двое падапечных. Кожнаму з іх была выдзелена пэўная сума грошай для развіцця і заданне, а потым назіралі і ацэньвалі ўжо ў паўфінале, што ў каго атрымалася. Прычым глядзелі менавіта на эканамічныя паказчыкі і на іх аснове вызначалі фіналістаў. Лічбы, якія прэзентуюць удзельнікі, шчыра кажучы, уражваюць. Плюс ацэньваліся прыкладзеныя намаганні і стаўленне да справы. Усе фіналісты стараліся, і тое, што яны прайшлі гэтае выпрабаванне праектам, дазволіла ім вырасці. Я параўнала б удзел у праекце «Мой бізнес» з катапультай. Цябе запускаюць на новы ўзровень, дапамагаюць стартапу выйсці на новую арбіту ў развіцці. Такая магчымасць выпадае не часта і не кожнаму. І не ўсе гатовы пайсці на такія перамены. Як ні смешна тое прагучыць, але многім з нашых паўфіналістаў было боязна пакінуць зону камфорту. Часам людзям патрэбен проста спакой. А наш праект наглядна ілюструе, які вынік можна мець, калі аб'яднаць магчымасці са здольнасцямі людзей. Гэта па сутнасці формула нарошчвання бізнесу. Мы паказалі, што калі ў цябе з'яўляюцца магчымасці, то варта дзейнічаць, рабіць усё залежнае ад цябе. І толькі той, хто ўмее выжываць ва ўмовах канкурэнцыі, дасягае поспеху.

— Вы неяк адзначалі, што былі ў захапленні ад знаёмства з ментарамі праекта «Мой бізнес». Спасціглі нейкія сакрэты?

— Кожны з нашых ментараў мае багаты жыццёвы і прафесійны вопыт. Кантактуючы з імі, я атрымлівала шмат цікавай практычнай інфармацыі. Напрыклад, ад Аляксандра Паліўкі можна даведацца пра тое, якія банкаўскія праграмы падтрымкі сёння існуюць для малога бізнесу, а яшчэ крэдыты і іншыя інструменты, што могуць дапамагчы прадпрымальніку. Алега Хусаенава можна таксама слухаць бясконца. Мне вельмі падабаецца, як ён сказаў, што трэба ўмець прэзентаваць свой праект у ліфце. Літаральна за хвіліны выкласці сваю ідэю так, каб ёю зацікавіўся інвестар. Бізнес — гэта спаборніцтва, і ты павінен быць пастаянна «ўключаны» ў тое, што адбываецца ў тваёй сферы. Трэба ўмець хутка бегчы і быць першым у нейкіх рэчах. Вашай перавагай заўсёды будзе навізна.

Працэс здымак вельмі цяжкі і доўгі, але калі да нашых ментараў звяртаюцца па параду нават у перапынках, то кожны з іх знаходзіць час выслухаць, дапамагчы. Вельмі ўдзячная нашаму пастаяннаму вядучаму Дзянісу Кур'янаву, бо ён сапраўдны прафесіянал. Мы супрацоўнічалі з ім упершыню, але тое, як чалавек з усімі на роўных падтрымліваў дыялог (ён мае свой вопыт вядзення бізнесу), нам вельмі дапамагло. Увогуле, працавала над праектам вялікая каманда... Я бачыла, як людзі прыходзілі і прэзентавалі свае ідэі, а ментары слухалі іх з цікавасцю. І гэта ўжо двухбаковы абмен вопытам. Многім змаглі дапамагчы і па-за межамі тэлевізійнага праекта. Была ў нас прэтэндэнтка на ўдзел, якая прыйшла з ідэяй адкрыць дзіцячы садок для дзетак з аўтызмам. У жанчыны была бізнес-мадэль, але там немагчымы прыбытак. Звярнуўшыся да нас, яна паспрабавала прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы асаблівых дзетак. І ментары вырашылі агульнымі намаганнямі выдзеліць ёй грошы, неабходныя для адкрыцця гэтага спецыялізаванага дзіцячага садка. Ён ужо працуе.

ПЛЮСЫ І МІНУСЫ З АКЦЭНТАМ

— Кастынг перад запускам праекта ў эфіры паказаў, што людзей з жаданнем рэалізаваць сябе ў бізнесе шмат. На ваш погляд, ці спрыяльныя ўмовы ў нас для прыватнага бізнесу?

— Я рызыкнула б адкрыць сваю справу і патлумачу чаму. Тут, як у размове пра напалову пустую і напалову поўную шклянку, філасофскае пытанне. Зразумела, ёсць пэўныя праблемы, мы пра іх ведаем, чытаючы тыя ж CMI. Але нячаста згадваем пра тое, што «шклянка напалову поўная», бо існуюць розныя нішы, дзе можна паказаць сябе. Увага большасці нашых людзей чамусьці факусіруецца на мінусах. У праекце «Мой бізнес» мы паспрабавалі паставіць акцэнты ў іншых месцах. Не малявалі карцінку, дзе ўсё добра, але паказалі людзей у рэальных умовах. Іх прыклады ілюструюць, што можа зрабіць прадпрымальнік, атрымаўшы фінансавую падтрымку і парады вопытнага ментара. Але ніхто за вас нічога не зробіць. У паўфінале мы маглі бачыць, як, атрымаўшы аднолькавыя грошы, людзі па-рознаму дзейнічалі. І мы паказвалі, з якімі праблемамі найчасцей сутыкаюцца прадпрымальнікі. Ёсць у нас праект, звязаны з дастаўкай фермерскіх прадуктаў. І яны па сутнасці першыя гульцы на гэтым полі, але няма каму дапамагчы ім выбудаваць закон, каб людзі маглі займацца сваёй справай. Ці прыклады з удзелам у выстаўках. Бізнесмену-пачаткоўцу за ўдзел у выставе за тры дні трэба заплаціць дзесяць мільёнаў. Дзе іх браць, калі бізнес яшчэ не дае прыбытку? Мы расказваем пра цяжкасці, аднак важна памятаць, што любое пытанне можна вырашыць і не варта засяроджвацца толькі на мінусах.

Бізнес — гэта спаборніцтва, і ты павінен быць пастаянна «ўключаны» ў тое, што адбываецца ў тваёй сферы.

— Рэакцыя ўдзельнікаў на разві цё падзей, калі справа тычыцца крытыкі, канкурэнцыі, адрозніваецца ў кадры і за кадрам?

— Патлумачу на простым прыкладзе: у вас ёсць дзіця, за яго вы адказваеце 24 гадзіны ў суткі. Здараецца, калі бацькі няправільна сябе паводзяць, то і на паводзінах дзяцей тое адбіваецца. Але, пачуўшы крытыку, заўвагу, разумны бацька прыслухаецца. І будзе імкнуцца скарэкціраваць сітуацыю. Тое ж мы назіраем на праекце. Удзельнікі ставяцца да сваіх стартапаў, як да дзецішча, якое, з аднаго боку, хочацца абараняць, а з іншага — рабіць лепшым. Яны спрачаюцца ў нейкіх момантах з ментарамі, не ўсё і не заўсёды прымаюць. І гэта нармальна, як і тое, што немагчыма выйсці на новы ўзровень, нічым не ахвяраваўшы, не страціўшы. Аб такой рызыцы нашых удзельнікаў ментары папераджаюць. Трэба быць гатовым да выбару. На крытыку ўсе па-рознаму рэагуюць, але адэкватна. Хто хоча перамагчы, той прыслухоўваецца. Разам з тым у прадпрымальніка павінна быць сваё меркаванне.

ПРАГРЭС І ВЫБАР КУРСУ

— Беларускія людзі бізнесу, якія яны?

— Па маіх назіраннях у рамках праекта, нашых бізнесменаў можна дзяліць па рэгіёнах. Сталічныя прадпрымальнікі хутчэй прымаюць рашэнні, бо ў Мінску канкурэнцыя большая і яны разумеюць, што калі знаходзіш магчымасць, то важна яе не страціць. А бізнесмены з іншых гарадоў паводзяць сябе больш асцярожна. І, мабыць, абедзве гэтыя якасці патрэбны, бо ў бізнесе трэба ўмець і хутка бегчы, і абдумваць свае наступныя крокі. Вялікі плюс нашых людзей таксама ў іх працавітасці. Праект скончыцца, але я хачу верыць, што нашым удзельнікам дапамогуць тыя якасці, якія яны тут набылі. Іх навучылі глядзець наперад і будаваць доўгатэрміновыя планы. Мэта любога бізнесу — атрыманне прыбытку. І трэба ўмець зрабіць дакладныя крокі, каб яго атрымаць. У кожнага з нашых гульцоў ёсць вынік і прагрэс, таму паглядзім, каго выберуць тэлегледачы.

— Праца на праекце «Мой бізнес» і вам дала новы вопыт...

— Гэты праект мы зрабілі ў новым фармаце. Колькі я працую на тэлеканале АНТ, увесь час займаюся праектамі, дзе ёсць месца псіхалогіі. Увогуле, мне падабаюцца жывыя праекты, калі яны змяняюць не толькі ўдзельнікаў, але і людзей па той бок экрана. Не проста з'яўляецца водгук у стылі «Ой, ну што там зрабілі на беларускім тэлебачанні», а ўзнікае жаданне падумаць пра ўласнае жыццё. І ў праекце «Мой бізнес» мне цікава назіраць за тым, як змяняюцца ўдзельнікі, як будуюць узаемаадносіны. Гэта дазволіла мне самой адкрыць для сябе свет прадпрымальнікаў, дзе людзі, насуперак любым перашкодам, усё роўна вераць у сваю справу і працягваюць займацца ёю. Мне такая праца дала добры вопыт, якім хочацца дзяліцца.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

«БЕЛАРУСЬ 1» ЗАВІТАЎ У ГОСЦІ ДА КАЦЯРЫНЫ КАРСТЭН

19 снежня канал «Беларусь 1» і Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі прадставяць гледачам дакументальны фільм «Кацярына Вялікая». Здымачная група пабывала ў гасцях у двухразовай алімпійскай чэмпіёнкі па акадэмічнай грэблі Кацярыны Карстэн.

Нядаўна Кацярына Карстэн заваявала ліцэнзію на Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанейра, якая стане сёмай у кар'еры нашай славутай зямлячкі. Яна была першай спартсменкай, якая прынесла суверэннай Беларусі перамогу на Алімпійскіх гульнях, першай і адзінай беларускай, хто пацвердзіў залатыя ўзнагароды на дзвюх Алімпіядах — у Атланце ў 1996-м і Сіднеі ў 2000 годзе. Кацярына Карстэн з'яўляецца першым кавалерам ордэна Айчыны ўсіх ступеняў.

Сёння спартсменка трэніруецца і жыве ў Германіі. Здымачная група Белтэлерадыёкампаніі адправілася ў Дормаген, каб сустрэцца з ёй падчас трэніровачнага працэсу. Чэмпіёнка распавяла не толькі пра поспехі мінулых гадоў, але і падзялілася планамі на будучыню — выйграць чарговы алімпійскі медаль. Журналістам удалося пазнаёміцца і з сям'ёй Карстэн, якая спадзяецца вярнуцца ў Беларусь па завяршэнні спартыўнай кар'еры Кацярыны.

— Мы хацелі ахапіць усю яе кар'еру — ад вясковай дзяўчынкі Каці Хадатовіч да вялікай спартсменкі ў акадэмічным веславанні, бо ні адзін беларус так доўга не трымаўся на вяршыні спартыўнага поспеху, як яна. Разам з аператарам Алегам Соркіным мы пабывалі ў Германіі, а таксама на малой радзіме Кацярыны Карстэн — у Крупскім раёне, у яе першага трэнера — у Мінску, выкарыстоўвалі архіўныя запісы, — распавёў аўтар фільма Мікалай Стула.

19 снежня ў 11.30 у гледачоў канала «Беларусь 1» з'явіцца магчымасць сустрэцца з любімай спартсменкай падчас прагляду фільма «Кацярына Вялікая», рэжысёрам якога стала Марыя Жукава.

ЗАНАДЗІЎ МЫЦКУ, А ТУТ СВАЯ ВОШ УКУСІЛА

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Асноўныя прыклады ўзяты з «Новай зямлі» Якуба Коласа. Такім чынам, ці ведалі вы, што:

Шпуль — прылада, якой карыстаюцца пры вязанні снапоў.

Покаўка — зародак парастка, тая ж пупышка.

На дрэве покаўка таўшчала,
У сабе лісточак далікатны,
Пахучы, свежанькі, прыўдатны
На добрым сонцы гадавала.

ПраснавАць — прайсці ў пэўным напрамку. *На станцыі было досыць пуста і ціха. Дзе-нідзе прасную людская фігура і знікне.*

ЗанАдзіць — прывабіць падкормкай, прынадай.

І з вудай дзядзька шчасце мае:
Язёў занадзіць і кілзае.

НакрОп — настой з пахучых траў для апырскання пчол.

Тут сіта выехала з рук,
А патрывожаныя пчолы
Спяваюць хорам як анёлы,
Але кусаюць па-чартоўску...
Угнуўся дзядзька — няма рады,
На землю падаюць прылады;
За імі дзядзька наш з накропам
З вярбы на землю шуснуў снопам.

Мыцка — маленькая куслівая мошка.

Як толькі добра сонца ўгрэе,
Кастусь у чоўне ўжо дурэе
без нагавіц, у адной кашулі,
і хоць за ногі мыцкі тнулі,
і запускалі як бы спіцы,
але скідаў ён нагавіцы.

Свая вош укусіла — адчуць асабіста жыццёвыя клопаты, сутыкнуцца з цяжкасцямі. Беларусы яшчэ скажуць: смажаны певень клюнуў, падпёрла да горла. Рускія — *жареный петух клюнул.* У Паўла Міско чытаем: «Кажуць, чалавек адразу сталее, як свая вош укусіць, сваё кубло завядзецца».

Малоць не падсяваючы — гаварыць глупства, пустасловіць. Беларускія сінонімы: мянціць языком, разводзіць тары-бары, араць дарогі, блынды правіць, круціць вала за хвост, плесці кашалі. Рускія аналагі: *переливать из пустого в порожнее, молоть языком*.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Тэлесеткі

«БЕЛАРУСЬ 4. БРЭСТ» — У ЭФІРЫ

У сем гадзін раніцы 15 снежня ў эфіры паявіўся новы рэгіянальны канал «Беларусь 4. Брэст». З гэтай нагоды ў брэсцкай студыі сабралася шмат гасцей. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС назваў падзею знакавай. Кіраўнік вобласці выказаў упэўненасць, што новы канал будзе працаваць на карысць гледачам, а работнікі тэлебачання напоўняць гадзіны вяшчання цікавым і якасным прадуктам.

Новы канал адрэкамендаваўся гледачам як праект для ўсёй сям'і. Тэлевізійнікі маюць намер прапанаваць шырокай аўдыторыі перадачы па гісторыі, грамадска-палітычным, культурным, спартыўным жыцці Брэстчыны. Акрамя таго, у сетку вяшчання ўвойдуць айчынныя і замежныя мастацкія фільмы, мультфільмы, дакументальнае кіно, а таксама забаўляльныя і пазнавальныя перадачы.

Стаць любімым каналам для жыхароў Брэсцкай вобласці пажадаў праекту старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 22.50 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 Серыял «Здрада».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.40 Меладрама «Заезджы маладзец».
13.35, 15.50 Драма «Зводная сястра». 1—2-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.40 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00, 21.45 Серыял «Ваенная разведка. Заходні фронт».
21.00 Панарама.
23.30 Дзень спорту.
23.45 Меладрама «Марыць не шкодна».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.05, 21.05 Тэлебарометр.
9.05 «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
10.40 М/с «Сябры анёлаў».
11.15 Азбука густу.
11.50 «Разбуральнікі міфаў».
12.55 «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
13.55 «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
15.10 Меладрама «Папялушка 4х4. Усё пачынаецца з жаданняў».
17.00 Перазагрузка.
17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
18.55 Серыял «Кухня».
19.55 Серыял «Васьмідзясятыя».
21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
22.05 КЕНА.
22.10 «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
23.15 Рэпарцёр.
0.00 Серыял «Косці».
0.50 Серыял «У эфіры».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.40 «Сусветная карцінная галерэя».
7.55, 12.40, 17.35, 23.30 «Калейдаскоп».
8.10, 11.40, 17.50, 21.00 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
8.15 «Край». Драма.
10.20 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
11.10 «Наперад у мінулае».
12.15 «Святыні Беларусі».
12.55 «Марыя, Мірабэла». Казка.
14.05 «Раман з лёсам». Спыніся і глядзі. Пра лёс вядомага фотамастака Георгія Тэр-Аванесава.
14.30 «Таямніцы палацавых пераваротаў». Драма. «Віват, Ганна!»
18.00 «Брэсцкая крэпасць». Драма.
20.10, 23.00 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
20.40 «Калыханка».
21.30 «Галасы часу». Юбілейны вечар заслужанага артыста Беларусі Анатоля Кашапарава.
23.45 «Геапалітыка: свет за тыдзень».

БЕЛАРУСЬ 5

7.05, 18.50 PRO спорт. Навіны.
7.15 Авертайм.
7.40 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Хімкі».
9.20 Хакей. Ароса-чэлендж. Славакія — Беларусь.
11.10 Хакей. Ароса-чэлендж.
13.00 Спорт-мікс.
13.20 Баскетбол. НБА. «Кліўленд» — «Філадэльфія».
15.11 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Мужчыны.
16.50 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
18.25 «Спорт, спорт, спорт». Зоя і Барыс Бальшаковы.
18.55 Змешаныя адзінаборствы. Fight Night.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Манчэстэр Сіці».
0.55 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!»
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.15 «Смак».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 «Адваротны адлік». «Гетман Агінскі. Палеская авантура». Фільм другі.
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Драма «Спадчыннікі».
23.55 Драма «Ператварэнне».
1.25 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае сняданне».
10.00 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Эліксір маладосці».
14.45 «Такі лёс».
15.35 «Самая карысная праграма».
16.50 «Вялікі горад».
18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Нас гадавалі нашы багі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 Драма «Паляванне».
1.25 «Дакументальны праект»: «Спадчыннікі багоў», «Сакрэтны план багоў».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30 Серыял «Школа для таўстушак».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
16.20, 2.30 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50, 3.00 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Шчасліўчык Пашка».
19.25 Серыял «Развод».
22.05 Маст. фільм «Дзве гісторыі пра каханне».
23.55 Галоўная тэма.
0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
1.00 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».
3.25 «Народы Расіі».
4.20 Маст. фільм «Хто стукаецца ў дзверы да мяне».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 Ток-шоу «Што адбываецца».
12.40 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 «Наш чалавек».
18.20 Серыял «Каменская».
20.55 Серыял «Земскі доктар».
21.55, 23.10 Серыял «Афіцэрскія жонкі».
23.50 «Сумленны дэтэктыў».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 Серыял «Адвакат».
7.10 «Акцэнты тыдня».
8.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.20 Серыял «Ляснік».
12.00 «Суд прысяжных».
13.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «Ядзім дома».
14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Іншы маёр Сакалоў».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Серыял «Каманда».
1.30 Серыял «Шэрыф».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.20, 19.50 Серыял «Злачынная імперыя».
8.20 Трагікамедыя «Гараж».
10.00, 16.30 «Аналітычная праграма».
10.10 Драма «Пунсовая літара».
12.30 «Кінаблакнот».
12.45, 13.50, 15.45, 16.40, 18.25, 19.35, 21.00 «Хатняя крама».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Палюбоўніцы».
17.00 Серыял «Пад купалам».
18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Камедыя «Рэальнае каханне».
23.30 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».

ВТВ

6.00, 7.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
6.30, 8.00, 13.10 Скетч-шоу «6 кадраў».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00 Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
10.00 «Кіно ў дэталях».
11.00 Трылер «Ларга Вінчы 2: Змова ў Бірме».
13.30 «Ералаш».
14.00 Серыял «Паласатае шчасце».
15.00, 5.00 Серыял «Нефармат».
16.00 «Турбаміксер».
17.00, 4.00 «Лаві момант».
17.30, 0.00 «Уральскія пельмені».
18.00, 23.00 Серыял «Сям'я 3D».
19.00 Серыял «Маладзёжка 3».
21.10 Камедыя «Неразважлівы».
0.30, 5.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».
4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00,19.30, 23.40 Навіны культуры.
10.15, 1.40 «Наглядальнік».
11.15 А.С. Пушкін. «Мяцеліца». Тэлеспектакль. Запіс 1984 года.
12.30, 22.50 «Пётр Фаменка. Лёгкае дыханне». Дак. фільм.
13.20 «Захавальнікі Меліхава». Дак. фільм.
13.45 «Кароль-алень». Маст. фільм.
15.10 «Дрэнны добры чалавек». Маст. фільм.
16.45 «Алег Даль». Дак. фільм.
17.25 Важныя рэчы. «Бюст Пабеданосцава».
17.40 Дзяніс Мацуеў. Фартэпіянны канцэрт на фестывалі ў Верб'е-2012.
18.35 «Каміль Каро». Дак. фільм.
18.45 «Кранштацкі міраж». Частка 1-я.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Саці. Нясумная класіка...»
20.45 «Правілы жыцця».
21.15 «Тым часам».
22.00 Прыступкі цывілізацыі. «Расшыфраваныя лініі Наска». Дак. фільм.
23.55 Мастсавет.
0.00 «Крытык».
0.40 «Князь». Дак. фільм.
2.40 «Pro memoria». «Капелюшы і капялюшыкі».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991.
7.15, 8.20, 11.05, 12.40, 14.35, 17.00, 20.35, 21.40, 23.00, 1.05, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.30 Дак. фільм «Міхаіл Шамякін. Споведзь мастака».
9.00 «Быў час». 2008 год.
10.00 Маст. фільм «Мае дарагія».
12.00 «Акулы пяра». Кабарэ-дуэт «Акадэмія». 1995 год.
14.00 Дак. фільм «Зоркі Савецкага спорту».
16.00 Маст. фільм «Падарунак лёсу».
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Музычны самвыдат». Аляксандр Кушнір, Алег Каўрыга. 2005 год.
19.00 Маст. фільм «Шчаня».
20.45, 2.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
1.30 Маст. фільм «Юлька».
4.00 «Колба часу».

EUROSPORT

5.00 Watts! Спецыяльны снежаньскі выпуск.
5.30 Watts! Спецыяльны верасьнёўскі выпуск.
6.30, 10.30, 13.30, 16.30, 21.15, 1.45 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
7.30, 11.30, 14.30, 17.30, 22.15, 2.30 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
8.00, 12.00, 15.00, 18.00, 22.45, 3.00 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
8.30, 15.30, 3.30 Зімовыя віды спорту.
9.30 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Турнэ 4-х трамплінаў. Лепшыя моманты.
18.30, 19.45, 23.15, 4.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
19.00 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
23.45 Конны спорт. Гран-пры «Алімпія».
0.00 Watts!
1.15 Конны спорт. «Клуб коннікаў».

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00 Серыял «Былыя».
6.25 Камедыя «Шалёныя прэпады».
8.00 Камедыя «12 калядных сабак. Цудоўнае выратаванне».
10.35 Камедыя «Supernянь».
12.20 Камедыя «Чалавек-эльф».

14.00, 14.50, 15.40, 0.55, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
14.20, 15.10 «Камедыянты (шоу)».
16.00 Меладрама «Prada і пачуцці».
18.45 Камедыя «Вялікае вяселле».
20.20 Камедыя «Амаль замужам».
23.10 Камедыя «Прышэльцы».
1.10 Камедыя «Горка! 2».
4.00 Камедыя «Горка».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.45 «Доктар І...»
8.15, 19.00, 1.35 «Гісторыя кахання». Серыял.
9.50, 3.40 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.40, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.35 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.30 «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
13.25 «Знак лёсу». Маст. фільм.
15.20, 3.00 «Нераскрытыя таямніцы».
16.15 «Мой герой».
17.05, 5.20 «Альфонсы. Каханне па правілах і без». Дак. фільм.
18.00 «Чалавек-прынада». Серыял.
20.55, 0.50 «Неспакойны ўчастак». Серыял.
21.55 «Двайное жыццё». Серыял.
23.00 «Часова даступны».
0.00 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.40, 14.30 Мюзікл «Бурлеск».
8.45 Камедыя «Флінтстоўны».
10.25, 4.10 Фантастыка «Дзіця чалавечае».
12.20 Мюзікл «Я сыходжу — не плач».
16.40 Трылер «Урачысты фінал».
18.20, 21.55 Камедыя «Драйвер на ноч».
20.00 Фантастыка «Філосафы: Урок выжывання».
23.40 Драма «Лофт».
1.35 Меладрама «Мажэсцік».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Трагікамедыя «Яно».
8.50 Баявік «На гульні 2».
10.35 Драма «Белая-белая ноч».
13.15 Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
14.55 Драма «Дачка».
16.50 Трылер «Юлечка. Смяротныя ўрокі».
18.40 Баявік «На гульні».
20.20 Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
22.10 Меладрама «Вораг нумар адзін».
0.10 Драма «Мама».
2.00 Драма «Танкер «Танга».
4.20 Камедыя «Дэжа вю».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Непаражальныя канструкцыі.
6.50, 13.45 Гульні розуму.
7.10 Папулярная навука.
7.35, 13.20 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Золата Юкана.
8.45 Незвычайныя здабычы.
9.30, 14.10, 19.30 Наступнае мегацунамі.
10.20, 14.50, 20.15 Даследчык 2.0.
11.00 Па слядах міфічных пачвар.
11.50 Ледзяная дарога.
12.35, 0.00 Сканеры старажытнага свету.
15.40 Дзікая прырода Амазонкі.
16.25 Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
17.10, 3.45 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
18.00 Асушыць акіян.
18.40, 21.45, 1.30, 5.15 Расследаванні авіякатастроф.
21.00, 0.45, 4.30 Мегазаводы.
22.30 Паранармальнае.
23.15 Эвакуацыя Зямлі.
3.00 Паветраныя асы вайны.

DISCOVERY

8.00, 12.30 Дарожныя каўбоі.
8.50 Адваротны бок хаосу.
9.45, 14.20, 21.30 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
10.40, 17.05 Прапажы на продаж.
11.35, 1.00, 7.10 Гульня на жыццё.
13.25, 19.00, 6.25 Не спрабуйце паўтарыць.
15.15, 5.35 Хуткія і гучныя.
16.10, 3.00 Махінатары.
18.00 Трой.
20.00 Эфект Карбанара.
22.00 Дзікая кухня.
23.00 Голыя і напалоханыя.
2.00, 4.50 Бітвы за кантэйнеры.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 22 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.20 Зона Х.
9.10 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Серыял «Здрада».
12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.25 Дэтэктыў «Ахоўныя асобы».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.40 Сфера інтарэсаў.
20.00, 22.15 Серыял «Ваенная разведка. Заходні фронт».
21.00 Панарама.
21.45 Буйным планам.
0.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 22.10 «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
10.10, 16.20 Трылер «Закрытая школа».
11.15, 0.05 Серыял «Косці».
12.15, 21.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
13.20, 19.55 Серыял «Васьмідзясятыя».
14.25, 18.55 Серыял «Кухня».
15.30, 23.15 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
22.05 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
0.55 Серыял «У эфіры».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.40 «Сусветная карцінная галерэя».
7.55, 12.20, 18.40, 0.40 «Калейдаскоп».
8.10 «Патоп». Маст. фільм.
12.55 «Музеі Беларусі». Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Музей выратаваных мастацкіх каштоўнасцей.
13.35, 18.55 «Размаўляем па-беларуску».
13.40, 0.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава.
14.10 «Святыні Беларусі».
14.35 «Галасы часу». Юбілейны вечар заслужанага артыста Беларусі Анатоля Кашапарава.
16.10 «Турандот». Драма.
17.45 «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Аляксандр Сафронаў.
19.00 «Купальская ноч». Камедыя.
20.10, 23.45 «Дыя@блог». «Пра мову».
20.40 «Калыханка».
21.00 «Песні навагодніх начэй». 30-я гады.
21.30 «Канец аперацыі «Рэзідэнт». Дэтэктыў.

БЕЛАРУСЬ 5

7.30 PRO спорт. Вынікі.
7.55 Баскетбол. НБА. «Аклахома» — «Лейкерс».
9.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
10.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Манчэстэр Сіці».
12.35 Спорт-мікс.
12.50 Формула-Е. Гран-пры Уругвая.
14.05 Снукер. Адкрыты Кубак Беларусі. 1/2 фіналу.
16.05 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Мужчыны.
17.00 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Жанчыны.
17.50 «Спорт, спорт, спорт». Зігмунд Мінейка.
18.20 Спорт-кадр.
18.50, 23.40 PRO спорт. Навіны.
18.55 Хакей. КХЛ. «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад) — СКА (Санкт-Пецярбург).
21.25 Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама» (Мінск).
23.50 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.15 «Смак».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Пятля Несцерава».
23.00 Драма «Давай зробім гэта па-хуткаму».
0.40 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Любоў да сабак абавязковая».
10.15 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Наша справа».
14.05 «Эліксір маладосці».
14.55, 23.40 «Белыя ваўкі». Серыял.
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Алкаголь прыдумалі масоны».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Тэрыторыя памылак».
22.05 «Глядзець усім!»
23.00 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
23.20 «Аўтапанарама».
1.20 «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным». «Сезон цудаў».
2.15 Дакументальны праект: «Тайна выратавання».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Даведнік».
9.10 «Агульны інтарэс».
9.40 Маст. фільм «Сон у руку або чамадан».
11.00 Маст. фільм «Дзве гісторыі пра каханне».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 19.25 Серыял «Развод».
15.05 «Справы сямейныя».
16.20, 2.40 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50, 3.05 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Шчасліўчык Пашка».
21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
22.05 Маст. фільм «Жонка Шчырліца».
23.55 Галоўная тэма.
0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
1.00 Маст. фільм «Таежная аповесць».
3.30 «Народы Расіі».
4.25 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Пакой смеху».
12.25. 23.50 «Расія без тэрору. Чачня. Адраджэнне». «Прататыпы. К-19».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 «Наш чалавек».
18.20 Серыял «Каменская».
20.55 Серыял «Земскі доктар».
21.55, 23.10 Серыял «Афіцэрскія жонкі».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 Серыял «Адвакат».
7.10 «Новыя рускія сенсацыі».
8.05 «Раніца з Юліяй Высоцкай».
9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.20 Серыял «Ляснік».
12.00 «Суд прысяжных».
13.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.45 «Справа густу».
14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Іншы маёр Сакалоў».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Серыял «Каманда».
1.30 Серыял «Шэрыф».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 Серыял «Злачынная імперыя».
8.30, 18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».
9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 21.00 «Хатняя крама».
9.45 «Кулінарныя парады».
10.10 «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
11.10 Драма «Белы алеандр».
12.45, 16.30 «Кінаблакнот».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Палюбоўніцы».
17.00 Серыял «Пад купалам».
19.50 «Каляды з героямі серыяла».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.20 Драма «Боскае нараджэнне».
23.30 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».

ВТВ

6.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
6.30, 8.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 23.00, 4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Сям'я 3D».
10.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка 3».
12.00 Камедыя «Неразважлівы».
13.45 «Ералаш».
14.00 Серыял «Паласатае шчасце».
15.00, 5.00 Серыял «Нефармат».
16.00 «Турбаміксер».
17.00, 4.00 «Лаві момант».
17.30, 0.00 «Уральскія пельмені».
21.10 Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
0.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Наглядальнік».
11.15, 0.00 «Амаль смешная гісторыя». Маст. фільм. 1-я серыя.
12.20, 22.50 «Пётр Фаменка. Лёгкае дыханне». Дак. фільм.
13.10 «Лапікавы тэатр». Дак. фільм.
13.20 «Пятае вымярэнне».
13.50 «Небяспечны паварот». Маст. фільм. Частка 1-я.
15.10 «Гульня ў бісер». «Х.К. Андэрсен. Казкі».
15.50 «Астравы». Іван Лапікаў.
16.30 «Расшыфраваныя лініі Наска». Дак. фільм.
17.25 «Звонавая прафесія». Дак. фільм. 1-я серыя.
17.40 «Формула поспеху!» Гала-канцэрт Камернага хору Маскоўскай кансерваторыі.
18.45 «Кранштацкі міраж». Частка 2-я.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 Штучны адбор.
20.45 «Правілы жыцця».
21.15 «Гульня ў бісер». «В. Распуцін «Развітанне з Мацёрай».
22.00 Прыступкі цывілізацыі. «Бляск і слава Старажытнага Рыма». Дак. фільм.
23.55 Мастсавет.
1.10 «Міхаіл Глузскі». Дак. фільм.
1.50 «Антоніа Сальеры». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Кабарэ-дуэт «Акадэмія». 1995 год.
6.40, 8.35, 11.05, 14.35, 15.40, 17.00, 20.20, 21.40, 23.00, 1.15, 2.20, 5.00 Музычная настальгія.
8.00 Дак. фільм «Зоркі Савецкага спорту».
10.00 Маст. фільм «Падарунак лёсу».
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Музычны самвыдат». Аляксандр Кушнір, Алег Каўрыга. 2005 год.
13.00 Маст. фільм «Шчаня».
14.45, 20.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
18.00 «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. Галіна Хомчык. 2007 год.
19.00 Маст. фільм «Кветкі для Олі».
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991. 2-я частка. Сяргей Дарэнка.
1.30 Дак. фільм «Міхаіл Шамякін. Споведзь мастака».
3.00 «Быў час». 2008 год.
4.00 Маст. фільм «Мае дараГія».

EUROSPORT

5.00 Watts! Спецыяльны сакавіцкі выпуск.
5.30 Watts! Спецыяльны жнівеньскі выпуск.
6.30 Тэніс. Australian Open. Лепшыя моманты.
7.30, 19.30, 21.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
9.30, 3.30 Веласпорт. Джыра д'Італія. Лепшыя моманты.
10.30 TIMBERSPORTS. Чэмпіянат свету.
12.15, 15.30, 18.30 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
12.45, 16.00, 19.00 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
13.15, 16.30 Зімовыя віды спорту.
14.15 Конны спорт. «Клуб коннікаў».
23.45 Бокс. Т. Цойге (Германія) — Э. Гуткнехт (Германія).
1.00 Акадэмія GT. Аўтаспорт.
1.15 «Погляд знутры».
1.20 Аўтаспорт. Формула Е.
1.45, 4.30 Watts! Спецыяльны вераснёўскі выпуск.
2.15 Strongest man.
3.15 Watts!

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00 Серыял «Былыя».
6.25 Камедыя «12 калядных сабак. Цудоўнае выратаванне».
8.05 Камедыя «Чалавек-эльф».
10.35 Меладрама «Prada і пачуцці».
12.20 Камедыя «Вялікае вяселле».
14.00, 14.50, 15.40, 2.40, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
14.20, 15.10 «Камедыянты (шоу)».
16.00 Камедыя «Прышэльцы».
18.45 Камедыя «Амаль замужам».
20.20 Камедыя «Няголены нянь».
23.10 Камедыя «Прышэльцы 2: калідоры часу».
1.10 Камедыя «Superнянь».
4.00 Камедыя «Горка! 2».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.45 «Доктар І...»
8.15, 19.00, 1.25 «Гісторыя кахання». Серыял.
9.50, 3.40 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.40, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.35 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.30 «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
13.30, 18.00 «Чалавек-прынада». Серыял.
14.30 «Простыя складанасці».
15.05, 2.55 «Нераскрытыя тайны».
16.05 «Мой герой».
16.55, 21.55 «Двайное жыццё». Серыял.
20.55, 0.40 «Неспакойны ўчастак». Серыял.
23.00, 5.15 «Зорныя гісторыі».
23.50 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.00, 1.10 Баявік «Планкет і Маклейн».
7.50 Меладрама «Мажэсцік».
10.20,2.55 Баявік «У промнях славы».
12.20 Камедыя «Дагары нагамі».
13.50 Фантастыка «Філосафы: Урок выжывання».
15.40, 4.55 Трылер «Жанчына ў чорным».
17.20 Прыгоды «Лекар: Вучань Авіцэны».
20.00 Трылер «Стоўн».
21.50 Драма «Добрай ночы, Месяц».
23.30 Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Фантастыка «Цяжка быць богам».
8.35 Драма «Гульні матылькоў».
10.20 Драма «Час пік».
12.15 Драма «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталінам».
13.50 Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
15.20 Камедыя «Усё ўключана 2».
17.05 Фантастыка «Індыга».
18.45 Баявік «На гульні 2. Новы ўзровень».
20.20 Камедыя «Ёлкі 1914».
22.25 Фантастыка «Форт Рос: У пошуках прыгод».
0.10 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!»
1.40 Драма «Пахаваеце мяне за плінтусам».
3.30 Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
5.10 М/ф «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Сканеры старажытнага свету.
6.50, 13.45, 18.00, 21.00, 0.45, 4.30 Гульні розуму.
7.10 Папулярная навука.
7.35, 13.20 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Наступнае мегацунамі.
8.45 Даследчык 2.0.
9.30, 14.10, 19.30 Асушыць акіян.
10.20, 14.50, 20.15, 0.00 Расследаванні авіякатастроф.
11.00 Па слядах міфічных пачвар.
11.50 Ледзяная дарога.
12.35 Сканеры старажытнага свету.
15.40 Дзікая прырода Амазонкі.
16.25 Тыраназаўр: чэмпіён па выжыванні.
17.10, 3.45 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
18.40, 21.45, 1.30, 5.15 Як перамагчы ва ўсім.
22.30 Паранармальнае.
23.15 Эвакуацыя Зямлі.
3.00 Паветраныя асы вайны.

DISCOVERY

8.00, 12.30 Хуткія і гучныя.
8.50 Не спрабуйце паўтарыць.
9.45, 14.20, 21.30 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
10.40, 17.05 Бітвы за кантэйнеры.
11.35, 7.10 Рачныя монстры.
13.25, 6.25 Аэрапорт знутры.
15.15, 5.35 Круты цюнінг.
16.10, 3.00 Махінатары.
18.00 Голыя і напалоханыя.
20.00 Дзікая кухня.
22.00 Мяцежны гараж.
23.00 Страсць да матораў.
0.00 Вулічныя гонкі.
2.00, 4.50 Іржавая імперыя.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

■ Ведай сваіх

НОВЫЯ ІМЁНЫ «МАЛАДЫХ ТАЛЕНТАЎ»

Сёлетні V Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», які праводзіў Першы нацыянальны канал Беларускага радыё з верасня па снежань, завершаны. А вось імёны яго пераможцаў будуць гучаць яшчэ не раз. Бо, відаць, для многіх юных талентаў спаборніцтва становіцца пачаткам вялікага шляху ў музыцы.

У гэтым годзе на ўдзел у конкурсе было пададзена 300 заявак ад маладых музыкантаў з розных куткоў Беларусі. У фінальны, трэці, этап прайшло 90 прэтэндэнтаў, што сімвалічна, бо само спаборніцтва было прымеркавана да 90-годдзя Беларускага радыё і Года моладзі. Творчасць канкурсантаў ацэньвала аўтарытэтнае журы, якое ўзначальваў народны артыст Беларусі, намеснік старшыні Беларускага саюза кампазітараў Эдуард Зарыцкі. У склад журы ўвайшлі таксама артыстка Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра эстрады Вікторыя Алешка, член Беларускага саюза кампазітараў, загадчыца аддзялення «Мастацтва эстрады» Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Алена Атрашкевіч, выканаўчы прадзюсар тэлеканала «Беларусь 1» Людміла Барадзіна, генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі Кірыл Казакоў, вядучая салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Настасся Масквіна, загадчыца аддзела музычных праграм Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Таццяна Сямёнава, народны артыст Беларусі Аляксандр Ціхановіч, народны артыст Беларусі, член Беларускага саюза кампазітараў Эдуард Ханок.

У адпаведнасці з палажэннем, журы конкурсу прыняло рашэнне: у намінацыі «Спадчына» аб'яднаць усе ўзроставыя катэгорыі і падзяліць на дзве групы (паднамінацыі) — ансамблі і салісты, а намінацыю «Эстрадны вакал» у сярэдняй узроставай катэгорыі таксама падзяліць на дзве групы — ансамблі і салісты .

Па выніках праслухоўвання «жывога выканання» ў Вялікай студыі Дома радыё найлепшымі сталі: у намінацыі «Эстрадны вакал» — Хэленэ Мэрааі (Мінск), Надзея Місякова (Мінск) і Аліна Мілаш (Івацэвічы). Сярод тых, хто дэманстраваў свае здольнасці ў намінацыі «Інструментальная музыка» журы вызначыла пераможцамі Кацярыну Блінкову (Мінск), Марыю Цхоўрабаву (Мінск) і Рамана Ждановіча (Салігорск). У намінацыі «Спадчына» сярод ансамбляў найлепшым на гэты раз стаў народны хор імя Глінкі (Мінск), а з ліку салістаў найбольш яркім палічылі выступленне Паліны Муравіцкай (Мінск). Многім іншым удзельнікам дасталіся таксама прызы і спецыяльныя дыпломы.

Музычныя творы ў выкананні пераможцаў і ўладальнікаў спецыяльных прызоў можна пачуць у эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё. У прыватнасці, у праграме «Маладыя таленты Беларусі» кожную нядзелю ў 11.30 радыёслухачоў чакаюць сустрэчы з удзельнікамі конкурсу. Варта нагадаць, што раней лаўрэатамі і прызёрамі гэтага творчага спаборніцтва былі такія артысты, як Алена Ланская, Кірыл Ермакоў, Лідзія Заблоцкая і многія іншыя.

Слухайце Першы нацыянальны канал Беларускага радыё і адкрывайце для сябе новыя імёны маладых таленавітых музыкантаў.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

■

СЕРАДА, 23 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.10 Зона Х.
9.10 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Серыял «Здрада».
12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
Расійскі рэжысёр Вадзім Абдрашытаў зняў свой першы фільм «Спыніце Патапава!» у 29 гадоў як дыпломную працу на рэжысёрскім факультэце УДІКа і праз некаторы час стаў плённа супрацоўнічаць са сцэнарыстам, а зараз ужо і рэжысёрам, Аляксандрам Міндадзэ. Сумесна яны стварылі адзінаццаць карцін, што былі запісаны ў актыў рускага артхаўснага кіно. Сам Вадзім Абдрашытаў з гэтым не згодны. Як аказалася падчас нашай размовы (рэжысёр прыязджаў у Мінск на кінафестываль «Лістапад», каб стаць старшынёй журы асноўнага конкурсу ігравога кіно), гэта не адзінае меркаванне крытыкаў, з якім ён не згодны.

— На мой погляд, з персанажаў вашых фільмаў можна вылучыць шэраг слабых мужчын. Пачынаючы з Патапава з вашай дыпломнай працы і Ведзянеева ў «Паваро-це». У нейкім сэнсе ў гэты шэраг упісваецца і Бялоў з «Палявання на ліс». Ці так гэта?

— Не зусім. Патапаў — не слабы мужчына. Ён проста зразумеў, што нічога, акрамя фармальнай лаяльнасці да грамадства і дзяржавы, ад яго не патрабуецца, таму ён фармальна лаяльны, фармальна працуе на заводзе, фармальна наведвае школу сына. Ён геніяльны ў сваёй пластычнасці і здольнасці прыстасоўвацца — гэта не слабасць характару, а спосаб жыцця. Ведзянееў, напэўна, і праўда слабы. Але Бялоў — чалавек, наадварот, моцны, ён спрабуе «падвярстаць» пад сябе маладога хлопца і прапанаваць таму спосаб існавання. І хоць Бялоў церпіць няўдачу, я не мог бы назваць яго слабым. Вось герой «Магнітных бур» Валера — сапраўды слабы мужчына, прычым яго слабасцю карыстаюцца пэўныя сілы.

— Ведзянееў у карціне «Паварот» шукае спосаб пазбегнуць пакарання за тое, што збіў пажылую жанчыну, але ў выніку добраахвотна прызнае сваю віну. Гэта маральны выбар ці стомленасць?

— Так, ён стаміўся змагацца... Гэта супала і з выбарам — складаны комплекс. Але, мяркуючы па тым, як ён сябе адчувае ў гэтай гісторыі, я думаю, Ведзянееў проста бязвольна махнуў рукой і стаміўся так сябе паводзіць.

— Па адной з драматургічных формул, датычнай у тым ліку да савецкага кіно, добрыя ўчынкі абавязкова прыводзяць да шчаслівага канца. Віктар Бялоў у «Паляванні на ліс» з высакароднымі памкненнямі вырашае накіраваць на правільны шлях маладога чалавека — гэта яго добры ўчынак. Але сістэма ламаецца — хэпі-энду не здараецца. Чаму?

— Таму што каштоўнасці і базавыя арыенціры, той спосаб жыцця, які Бялоў прапануе і нават навязвае маладому чалавеку, сатлелі. «Трэба адслужыць у арміі, абавязкова працаваць на заводзе, ажаніцца, займацца спортам». Але гэтага настолькі мала, што ў выніку і сам Бялоў адчувае дэфіцыт нейкай духоўнасці. Ідэалогія гегемона, гэта значыць нашага героя, церпіць няўдачу, таму што на самай справе яму няма чаго прапанаваць.

«Нашу гутарку даволі проста зняць. Дастаткова паставіць камеру, зняць агульны план, потым вас, мяне — і гатова. Але гэта толькі літаральна запісаная размова».

— Спынены цягнік, параход, які пайшоў на дно... Ці маюць месца ў фільмах «Спыніўся цягнік» і «Армавір» алюзіі да глабальных падзей?

— У дачыненні да карціны «Спыніўся цягнік» гэтую тэмпературу можна падняць штучна і вызначыць адсылкі да іншых падзей, хоць мы іх не мелі на ўвазе. Дзіўна іншае: расказаная намі гісторыя ўжо пасля выхаду фільма ў пракат адбылася ў, як аказалася, існуючым горадзе Каменск, хоць для нас гэта была выдуманая назва. У гэтым населеным пункце сышла платформа і ўрэзалася ў пасажырскі цягнік. А вось карціна «Армавір» прэтэндуе на абагульненне: даўно праржавелы карабель тоне, і пасля крушэння людзі на беразе шукаюць страчаныя чалавечыя сувязі. Гэта фільм пра 1990-я.

— Вашы фільмы, знятыя ў супрацоўніцтве з Аляксандрам Міндадзэ, часта разглядаюць як мастацтва, якое перадае «экзістэнцыю савецкай цывілізацыі», раскрывае паняцце «Homo Soveticus». Што вы адчулі ў 1991 годзе, калі на вашых вачах, можна сказаць, разбурылася вывучаемае асяроддзе?

— Так, некаторыя крытыкі звязвалі паняцце «Homo Soveticus» з маімі фільмамі. Але многія іншыя бачылі глыбей. Як я цяпер разумею, сэнсавы і эмацыйны аб'ём маім карцінам забяспечвала больш універсальная фактура, інакш яны састарэлі б яшчэ ў 1991 годзе. Напрыклад, геаграфія і сэнс фільма «Слуга» шырэйшыя — ён пра ўладу і свабоду, гаспадара і раба. Я ўжо не кажу пра «Парад планет» — што там савецкага?

— А ці не меркавалася, што рабалепства персанажа «Слугі» выгадавана савецкай сістэмай?

«Як я цяпер разумею, сэнсавы і эмацыйны аб'ём маім карцінам забяспечвала больш універсальная фактура, інакш яны састарэлі б яшчэ ў 1991 годзе».

— Гаворка ідзе пра лад чалавечага грамадства ўвогуле. Сістэмы ў рознай ступені карыстаюцца тымі ці іншымі якасцямі чалавека. Адно грамадства спрабуе рэалізаваць найлепшае ў чалавеку, іншае — наадварот. Дык вось усё, што адбылося ў 1991 годзе, не стала ні для мяне, ні для Міндадзэ нечаканасцю. Мы выдатна разумелі, што адбываецца. І пасля распаду Савецкага Саюза калізіі засталіся тымі ж: раб-гаспадар, чалавек-грамадства, свабода-несвабода, вайна-мір, мужчына-жанчына, каханне-нянавісць.

Ірына Мураўёва і Уладзімір Гасцюхін у фільме «Паляванне на ліс».

— Героі вашых карцін шматмерныя. Як гэта дасягаецца ў кінематографе?

— Калі шматмернасць мае месца быць, значыць, героі на экране — не функцыі, не плоскія, кардонныя фігуры, а жывыя людзі. Значыць, нягледзячы на ўмоўнасці кінематаграфічнага плана, фільм падобны на жыццё. А каб персанаж здаваўся жывым, трэба правільна перадаць і аб'ёмна паказаць яго характар. Гэта пытанне якасці мастацкай працы над вобразам.

— У якім становішчы, на ваш погляд, сёння знаходзіцца расійскае кіно? Ці сапраўды яно зайшло ў тупік?

— Яно знаходзіцца ў цяжкім становішчы. Грошай усё менш і менш, сумы ў каштарысе адпаведна таксама, а пракат фільмаў на федэральным узроўні не наладжаны: на экраны трапляюць тыя карціны, якія, па меркаванні пракатчыкаў, могуць сабраць касу, астатнія карціны даходзяць да гледача з цяжкасцю. Добрых фільмаў становіцца менш, таму што грошай у краіне становіцца менш. Нягледзячы на гэта, ёсць аўтары, хоць іх і не шмат, якія ў кіно бачаць не толькі вытворчасць тавару для касы, але і мастацтва.

— Ці заўсёды якасць фільма залежыць ад сум у каштарысе?

— Не заўсёды. Але здароўе таксама нельга купіць за грошы, хоць яны даюць больш гарантый на яго захаванне. Зараз і дзяржава, і спонсары паводзяць сябе больш сціпла і асцярожна, чым гэта было, скажам, у 1990-х гадах. Тым не менш вартае кіно ёсць — гэта працы Мікалая Хамерыкі, рэжысёра ад слова «кінамастацтва» (напрыклад, некалькі гадоў таму ён зрабіў бліскучую карціну «Сэрца бумеранг»), Сяргей Лобан, аўтар «Шапіто-шоу», мой вучань Аляксей Мізгіроў.

Вадзім Абдрашытаў з жонкай — мастачкай Натэлай Таідзэ — на «Лістападзе».

— Можа, тупік кіно не ў апошнюю чаргу звязаны са сцэнарным крызісам?

— Крызіс не толькі сцэнарны, ён назіраецца таксама ў літаратуры, тэатры, выяўленчым мастацтве, музыцы і звязаны з адсутнасцю нейкай ідэі, якая магла б апладатварыць усё мастацтва. Як гэта адбылося пасля Другой сусветнай вайны ў Італіі: з'явілася вялікая па сіле і прастаце мастацкая ідэя, якая прадугледжвае, што чалавек, які сядзіць побач, не менш цікавы, чым маштабныя баталіі ці глабальная гісторыя. Пачалася эпоха італьянскага неарэалізму, якая дала нам, напрыклад, карціну «Выкрадальнікі раваraў» Віторыа дэ Сіка і апладатварыла ўвесь кінематограф, у тым ліку савецкі. Тут быў час «адлігі», і рэнесанс айчыннага кінематографа, несумненна, быў звязаны з італьянскі неарэалізмам. Мастацкая ідэя дала штуршок і Новай хвалі ў Францыі, незалежнаму кіно ў Амерыцы, Германіі і гэтак далей. А калі ідэі няма (на сённяшні дзень яе няма), тады ўзнікае крызіс.

— А якая ідэя спарадзіла новую хвалю французскага кіно?

— Тая ж — цікавасць да простага чалавека. У адным месцы ў адзін час сабраліся некалькі выбітных людзей — Труфо, Гадар, Рамэр і іншыя аўтары, і на экране з'явіліся новыя героі. Напрыклад, школьнік Антуан Дуанэль у карціне Франсуа Труфо «400 удараў», за якім рэжысёр пільна сочыць і з гуманістычнай пазіцыі выбудоўвае яго свет, праз які перадае стан розумаў і душ наогул. Цяпер мастацтва страціла цікавасць да чалавека, а раз так, то і чалавеку яно нецікавае.

— Да гэтага часу чуецца меркаванне, што кіно — проста эклектыка, маўляў, сабрала ў сабе жывапіс, тэатр, музыку...

— Гэта кажуць непісьменныя людзі, а непісьменных людзей у нас большасць.

«Тэхналогія аднолькавая: у аснове ўсіх фільмаў ляжаць сцэнарыі, ролі выконваюць акцёры, выкарыстоўваецца, умоўна кажучы, цэлулоідная плёнка, але ж якасць кінамовы адрозніваецца».

— У нас жа ўсе пагалоўна з вышэйшай адукацыяй.

— Гэта не забяспечвае пісьменнасць. Больш за тое, людзей, якія адчуваюць мастацтва, — адзінкі. Далёка не кожны ў вялізнай зале кансерваторыі адчувае музыку. Тое ж у дачыненні да паэзіі, выяўленчага мастацтва, кіно, у рэшце рэшт.

— Сваю першую працу — дыпломную — вы знялі ў 29 гадоў. Ці згодны з меркаваннем, што аўтар павінен не проста валодаць тэхнікай, але ў першую чаргу нешта з сябе ўяўляць, што напрацоўваецца з узростам?

— Для стварэння кіно трэба мець хоць мінімальны жыццёвы вопыт. У творчых ВНУ выкладаюцца сэнсаўтваральныя рэчы, але драматургі, рэжысёры, наогул аўтары павінны атрымліваць адукацыю і ад самога жыцця. Сёння, на жаль, ідэальным абітурыентам лічыцца ўчарашні школьнік. Гэта слаўная моладзь, часам, несумненна, таленавітая, але можна задумацца, аб чым, уласна кажучы, яна будзе распавядаць гледачу? Ёсць два варыянты: яна можа альбо пераказваць і перайманаць, альбо распавядаць пра тое, што ведае, але ў такім выпадку павінна быць гатова да таго, што гледачу гэта будзе нецікава. Творчыя інстытуты надзвычай «памаладзелі», што абавязкова прывядзе да інфантылізацыі зместу экрана і тэатральных падмосткаў. Калі я вучыўся ва УДІКе, з дваццаці студэнтаў у нас былі толькі два ўчарашнія школьнікі. Аснову ж складалі дарослыя людзі з розных сфер, і гэтая рознасць дазваляла ў працэсе навучання яшчэ і абменьвацца жыццёвым вопытам.

«Расказаная намі гісторыя ўжо пасля выхаду фільма ў пракат адбылася ў, як аказалася, існуючым горадзе Каменск, хоць для нас гэта была выдуманая назва».

— Вы згадвалі, што кіно можа быць мастацтвам, а можа — таварам для касы. А што такое мастацтва кіно?

— Пытанне ў наяўнасці або адсутнасці кінапаэтыкі, кінамовы. Калі ў экранным мастацтве гісторыя распавядаецца некінематаграфічным спосабам, атрымліваюцца ўсяго толькі «гаворачыя галовы». Але ўспомніце феномен Курасавы, Бергмана, Феліні, Антаніёні, Хуцыева. Здавалася б, тэхналогія аднолькавая: у аснове ўсіх фільмаў ляжаць сцэнарыі, ролі выконваюць акцёры, выкарыстоўваецца, умоўна кажучы, цэлулоідная плёнка, але якасць кінамовы адрозніваецца. Карацей, мастацтва кіно вызначаецца тады, калі вы не можаце пераказаць убачанае на экране, а калі пераказваеце, страшэнна спрашчаеце. Нашу гутарку даволі проста зняць. Дастаткова паставіць камеру, зняць агульны план, потым вас, мяне — і гатова. Але гэта толькі літаральна запісаная размова. А можна зняць нашу гутарку такім чынам, што ў кадры будзе прысутнічаць нешта яшчэ. Што называюць атмасферай, танальнасцю, жанравым зрухам, умоўнасцю. Быццам бы абсалютная фактаграфія, але ёсць яшчэ нешта, што перадаецца кінамовай. У гэтым феномен кіно.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■

Извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал» с понижением начальной цены

Организатор торгов	Ликвидационная комиссия УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал», 223710, Минская обл., г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 25
Продавец	УПП «Янина» ОАО «ЛМЗ Универсал», тел. 8 017 4 26 98 16
Форма проведения торгов	Торги в форме аукциона
Дата и место проведения торгов	28.12.2015 в 13.00 в конференц-зале ОАО «ЛМЗ Универсал»: 223710, Минская обл., г. Солигорск, ул. Заводская, 4
Сведения о предмете торгов	Согласно Приложению
Порядок ознакомления	Ознакомиться с предметом торгов можно в пн.–пт. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 38 (26 98 16). Срок для ознакомления – до окончания приема заявлений
Дата и место начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов	Заявление на участие в аукционе подается заинтересованным лицом в срок до 25.12.2015 комиссии по организации аукциона пн.–пт. с 10.00 до 14.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заводская, 4, тел. 8 017 4 26 99 39. Заявление на участие в аукционе после указанного срока не принимается. К заявлению представляется документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка и другие документы согласно перечню, указанному в извещении
Размер, порядок и сроки внесения задатка, банковские реквизиты, на которые должна быть перечислена сумма задатка	Сумма задатка устанавливается в размере 10% от начальной цены предмета торгов (лота). Р/с 3012141892018 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Солигорска, код 153001369, УНП 600270786. Назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах	Лицом, желающим участвовать в торгах представляются: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава, имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов
Порядок оформления участия в торгах	К участию в торгах допускаются лица, подавшие комиссии по организации аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке
Порядок проведения торгов	Шаг аукциона – 5%. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) данный участник становится претендентом на покупку. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией по организации аукциона и победителем торгов, утверждается организатором торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в 10-дневный срок с даты подписания протокола после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов
Условия оплаты	Согласовываются Победителем аукциона и Продавцом при заключении договора купли-продажи
Возмещение затрат на организацию и проведение торгов	Возмещение затрат на организацию (публикации в СМИ, поиск потенциальных покупателей и т.п.) и проведение торгов (оплата услуг аукциониста) производится победителем аукциона путем перечисления на расчетный счет в течение пяти дней со дня проведения торгов

Приложение к Извещению

Лот №	Наименование товара	К-во, шт.	Начальная цена за ед., с НДС, бел. руб.
1	Машина раскройно-ленточная РЛ-630-01 г.в.1993	1	4 320 000
2	Машина швейная класса 10-Б	1	540 000
3	Машина швейная класса 10-Б	1	540 000
4	Машина швейная класса 10-Б	1	540 000
5	Машина швейная класса 51-А	1	1 404 000
6	Машина швейная класса 51-А	1	1 404 000
7	Машина швейная промышленная петельная ZOJE ZJ 781 инв. 0053	1	8 640 000
8	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
9	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
10	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
11	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
12	Машина швейная промышленного класса 1022	1	1 188 000
13	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
14	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
15	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
16	Машина швейная промышленного класса 1022	1	1 188 000
17	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
18	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
19	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
20	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
21	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
22	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
23	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
24	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
25	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
26	Машина швейная промышленного класса 1022	1	864 000
27	Машина швейная промышленного класса 1676	1	540 000
28	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-264	1	2 160 000
29	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-264	1	2 160 000
30	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-2745-329	1	2 160 000
31	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-2745-329	1	2 160 000
32	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-2745-329	1	2 160 000
33	Машина швейная станочно-обметочная, кл.51-2745-329	1	2 160 000
34	Машина швейной пром. «Текстима» 8332	1	2 700 000
35	Машина электрическая раскройная ЭЗМ 3	1	1 620 000
36	Машина электрическая раскройная ЭРМ 4160	1	2 160 000
37	Оверлок ZOJE ZJ732-70 А инв.1500	1	9 720 000
38	Оверлок ZOJE ZJ732-70 А инв.0052	1	9 720 000
39	Полуавтомат швейный промышленный класса 827	1	2 160 000
40	Принтер этикеток TSC TTR-224 Plus SU (99-118A045-00LF). Артикул 99-118A045-00LF	1	5 400 000
41	Производственная швейная машина Protex TY-B721-5A серийный № 130500349	1	7 344 000
42	Производственная швейная машина Protex TY-B721-5A серийный №121001205	1	7 344 000
43	Производственная швейная машина Protex TY-B721-5A серийный № 121001208	1	7 344 000
44	Производственная швейная машина Protex TY-B721-5A серийный № 121001207	1	7 344 000
45	Производственная швейная машина Protex TY-B721-5A серийный № 121001206	1	7 344 000
46	Промышленная швейная машина GEM757	1	6 480 000
47	Промышленная швейная машина GLOBAL OV	1	6 480 000
48	Промышленная швейная машина GLOBAL OV	1	6 480 000
49	Промышленная швейная машина Protex TY--B721-3A серийный № 121001204	1	7 344 000
50	Промышленная швейная машина Protex TY--B721-3A серийный № 130500347	1	7 344 000
51	Промышленная швейная машина Protex TY--B721-3A серийный номер 121001203	1	7 344 000
52	Промышленная швейная машина Protex TY-3300C серийный номер 130402285	1	7 992 000
53	Промышленная швейная машина Protex TY-373	1	15 768 000
54	Промышленная швейная машина Protex TY-900	1	28 620 000
55	Промышленная швейная машина Protex TY-9820-00	1	167 400 000
56	Промышленная швейная машина Protex TY-B777 серийный №120600533	1	8 100 000
57	Промышленная швейная машина Protex TY-B777 серийный №120600541	1	8 100 000
58	Промышленная швейная машина Protex TY-DM901 9 игл	1	129 600 000
59	Раскройный нож Protex TY-1 D=50мм дисковый, б/н	1	734 400
60	Раскройный нож Protex TY-1 D=50мм дисковый, б/н	1	734 400
61	Раскройный нож Protex TY-K 103 12 сабельный	1	4 320 000
62	Стол с пароотводом, серийный №ХТ-0873	1	4 860 000
63	Стол с пароотводом, серийный № ХТ-0871	1	4 860 000
64	Устройство для установки кнопок и блочков	1	648 000
65	Компьютер «ISC»	1	7 821 000
66	Компьютер Ф-500	1	1 710 000
67	Машина вычислительная электронная	1	5 850 000
68	Ноутбук Dell Inspiron 3521	1	2 853 000
69	Персональная ЭВМ	1	2 412 000
70	Плоттер HP DesignJet T520 36 in ePrinter (с ПП «Автокрой»)	1	19 800 000
71	Сотовый телефон Sony D2403 (Xperia M2 aqua)	1	3 600 000
72	Факсовый аппарат «Панасоник КХ-ФТ988»	1	1 800 000
73	Часы цифровые «Электроника»	1	630 000
74	Электросчетчик AV 10-TL-B-4	1	1 800 000

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «СМТ № 41» г. Сморгонь, Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24**

Предмет аукциона (имущество продается одним лотом)

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь	Назначение
Административное здание	442/С-8518	96,9 кв.м	Здание административно-хозяйственное
Растворный узел	442/С-8524	148,5 кв.м	Здание специализированное для производства строительных материалов
Склад	442/С-8527	211,0 кв.м	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ
Столярный цех	442/С-8522	501,4 кв.м	Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель
Пилорама	442/С-8521	239,4 кв.м	
Гаражи	442/С-8523	572,1 кв.м	Здание специализированное автомобильного транспорта
Составные части	в том числе навес для техники 282,2 кв.м		

Месторасположение предмета аукциона: Гродненская обл., Островецкий р-н, г.п. Островец, ул. Карла Маркса, д. 37

Начальная цена с НДС 20% – 2 260 800 000 белорусских рублей

Сведения о земельном участке	Для содержания и обслуживания производственной базы продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок площадью **2,2911** га

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**5** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 01.12.2015 г.**

Дата и время проведения аукциона	**29.12.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**28.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

Страховой полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) № 146586 серия НВБ ЗАСО «Белнефтестрах» **считать недействительным.**

29 декабря 2015 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 22.12.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПОКОЛЮБИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность, расположенного на территории Поколюбичского сельсовета

Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена предмета аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона	Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета
321084803101000117 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1500 га. Гомельская область, Гомельский район, п. Красный Маяк, участок № 28	Водопровод имеется. Дорога в гравийном исполнении	105 123 915 белорусских рублей	Расходы в сумме 11 533 700 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 10 515 000 белорусских рублей на р/с 3641414130036 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель – Поколюбичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901

Аукцион проводится 03 февраля 2016 года в 15.00 по адресу: Гомельский район, агрогородок Поколюбичи, ул. Ленина, 138, кинозал Поколюбичского сельского Дома культуры.

Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Поколюбичи, ул. Ленина, 133, 1 этаж, каб. 3 с даты опубликования по 28.01.2016 с 8.30 до 17.00, обед – 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Поколюбичским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право приобретения земельного участка в частную собственность;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Поколюбичи, ул. Ленина, 133. Тел.: 924-248, 924-566.

КУЛІНАРНАЯ ФЕЕРЫЯ

Магіляўчанка пакарыла сусветных кандытараў сваімі салодкімі работамі на фестывалі ФУД ШОУ, што прайшоў у Расіі

Фота БЕЛТА.

— На конкурсе я вельмі перажывала, — прызнаецца кандытар Наталля ШАРАЙ. Канкурэнцыя была вялізная! У Маскве сабраліся найлепшыя кулінары з сарака краін свету. Да гэтага часу не магу паверыць, што Гран-пры ўручылі мне!

На «кулінарную феерыю» Наталля прывезла работы з пасцілажу, шакаладу і салёнага цеста. Асабліва ўсіх ўразіла незвычайная скульптура Бабы-ягі.

— Мая казачная гераіня зусім не жудасная, якой яе звычайна малююць у народных казках. Яна модная і сучасная. Я прыбрала яе ў ажурную, экстравагантную сукенку, «абула» ў модныя басаножкі на высозных абцасах і зрабіла ёй класную прычоску. Ад маёй шакаладнай бабусі не адыходзілі! Здзіўляюся, як яна яшчэ не растала ад мігацення фотаўспышак, — з усмешкай кажа Наталля.

Дарэчы, са скульптурай нічога не здарылася. Яна ўжо вярнулася на радзіму, у Магілёў, і сёння ўсе ахвотныя могуць палюбавацца ёю ў фірменнай краме кампаніі «Дамачай», што на вуліцы Касманаўтаў, 39. Шкада, што да горада на Дняпры не даехалі яшчэ дзве конкурсныя работы — сукенкі «Лістапад» і «Снежань», якія ўдзельнічалі ў модным феерычным дэфіле «12 месяцаў».

— Нам трэба было незвычайна аздобіць уборы ад вядомага мадэльера-дызайнера Каці Андзяржанавай. За некалькі гадзін на сукенках расцвілі велізарныя экзатычныя бутоны з пасты, цукру і жэлаціну. Кветкі атрымаліся лёгкія і паветраныя, даводзілася ўсё рабіць з ювелірнай дакладнасцю! Самае галоўнае, што ўбранне было ядомае.

Але ажурныя кветкі так ніхто і не паспытаў: дызайнеры своечасова схавалі салодкія ўборы. Дарэчы, для Наталлі маскоўскае Гран-пры не стала першай узнагародай. Яе кулінарнае майстэрства ўжо не раз высока ацэньвалі ў розных міжнародных конкурсах. У скарбонцы таленавітай магіляўчанкі захоўваюцца тры залатыя медалі за яе шакаладныя шэдэўры. Напрыклад, адзін Наталля заваявала на Сусветным кулінарным кубку ў Люксембургу. У аснове яе 50-кілаграмовай кандытарскай кампазіцыі быў шакаладны фермер. А вакол яго — дзівосны восеньскі антураж: вазок з новым ураджаем, гарбузы і вялікія сланечнікі. Фермер быў апрануты ў стыльны клятчасты касцюм, на яго галаве красаваўся цыліндр, з-пад якога выбівалася капа рудых валасоў.

— Гэтую работу да конкурсу я давезла не зусім цэлай. Галоўны герой па дарозе... страціў сваю галаву. Але за тры гадзіны я яго падрамантавала. Нягледзячы на такую непрыемную акалічнасць, работа атрымала добрыя балы і водгукі.

Наталля часта раз'язджае па замежных краінах са сваімі кулінарнымі шэдэўрамі. Але ж асноўнае месца яе працы — у булачна-кандытарскай кампаніі «Дамачай». Заказаў у кулінарнай каралевы хоць адбаўляй!

Хрысціна ХІЛЬКО

Даты Падзеі Людзі

18 СНЕЖНЯ

1800 год — 215 гадоў таму нарадзіўся (мястэчка Крывічы, цяпер Мядзельскі раён) Іосіф Іванавіч Ходзька, ваенны геадэзіст і тапограф, генерал-лейтэнант. У 1821 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. У 1822-м быў залічаны ў Корпус ваенных тапографаў і пачаў работы ў Латвіі, Літве, Гродзенскай і Мінскай губернях. З 1831 года праводзіў тапаграфічную працу на Дунаі і Басфоры. Потым быў накіраваны на Каўказ і на Паўночны Каўказ. Па выніках яго дзейнасці заснавана сучасная картаграфія гэтага рэгіёна. Склаў першую карту Каўказскіх гор. Адзін з першых ажыццявіў узыходжанне на Арарат у 1850 годзе і быў залічаны ў альпінісцкі клуб Францыі. У 1869-м узнагароджаны вялікім Канстанцінаўскім медалём Расійскага геаграфічнага таварыства, яго ганаровы член. Каўказскі філіял РГТ у Тыфлісе зацвердзіў прэмію імя Іосіфа Ходзькі за найлепшую геаграфічную працу па каўказскай тэматыцы. Памёр у 1881 годзе.

1920 год — 95 гадоў таму створаны Савет Народных Камісараў Беларускай ССР, найвышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзяржаўнай улады, урад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1920—1946 гадах. Ён быў утвораны згодна з дапаўненнямі да Канстытуцыі 1919 года, якія былі прыняты 2-м Усебеларускім з'ездам Саветаў. Да сакавіка 1924 года абавязкі старшыні ЦВК і СНК, наркама па замежных справах выконваў А.Р. Чарвякоў. Членамі СНК былі народныя камісары (кіраўнікі наркаматаў), старшыні Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі (ВСНГ) і НК. Пры СНК дзейнічалі пастаянныя камісіі: Эканамічная нарада, Камісія заканадаўчых меркаванняў, Дзяржаўная планавая камісія. СНК БССР ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва рэспублікай праз наркаматы, выканкамы Саветаў, прымаў пастановы і выдаваў распараджэнні па ўсіх пытаннях, якія не ўваходзілі ў выключную кампетэнцыю Усебеларускага з'езда Саветаў, ЦВК БССР і яго Прэзідыума. СНК быў падсправаздачны з'езду Саветаў і ЦВК БССР. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 26 сакавіка 1946 года СНК БССР пераўтвораны ў Савет Міністраў БССР (цяпер — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь).

1925 год — 90 гадоў таму ў Маскве адбыўся XIV з'езд УКП (б), які абвясціў курс на індустрыялізацыю краіны.

Было сказана

Аляксей ЗАРЫЦКІ, паэт:

«Любоў і сама, як шыпшына: адплаціць яна
За дотык бяздушны і грубы, адплаціць заўсёды».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.24	16.48	7.24
Віцебск —	9.21	16.29	7.08
Магілёў —	9.14	16.37	7.23
Гомель —	9.02	16.43	7.41
Гродна —	9.38	17.05	7.27
Брэст —	9.30	17.14	7.44

Месяц

Першая квадра ў 17.14.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Генадзя, Захара, Савы, Сяргея.*
К. *Ларысы, Багуслава, Віктара, Паўла.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Я з таго пакалення, калі дзяцей у дварах было больш, чым цяпер машын.

— Хочаш чаю?

— Так, давай. М-м-м, які прыемны смак і водар! І такі моцны! Што гэта за чай — «Ліптан», «ЭрлГрэй»?

— Віскі.

— Чаму ты ўвесь час адпачываеш менавіта ў Сочы?

— Ну а як жа! У мяне там столькі сяброў! Таня Іванова, Алена Пятрова, Галечка Сідарава.

— Добра табе — столькі сяброў!

— Але і ворагаў хапае. Ігар Іваноў, Міша Пятроў, Вова Сідараў...

— Жонка вырашыла грыбамі заняцца. Назбірала, насаліла, разаслала сваякам.

— І што сваякі кажуць?

— Няма ў нас цяпер сваякоў...

ПРОДАЕМ
СЕТКА-РАБИЦА от производителя – 155 000 рублей;
ТЕПЛИЦА 3 410 000 рублей;
СТОЛБЫ 91 500 рублей;
ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ
БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 12 960 000 рублей;
АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 1 350 000 рублей
ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней
Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.
УНП 391802438

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4986.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 снежня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12